www.nv-online.info

№ 102 (3843)

27 снежня 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!



БЕЛАРУСЬ—РАСІЯ

За што?

Расія дасць Беларусі дадатковы крэдыт. Пра гэта паведаміў расійскі прэзідэнт паводле вынікаў пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы.



Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што адпаведнае рашэнне прыняў урад Расіі, які вырашыў “падтрымаць калег у сувязі з тым, што адбываецца на сусветных рынках, і даць Рэспубліцы Беларусь дадатковыя крэдытныя сродкі ў 2014 годзе ў аб’ёме да 2 мільярдаў долараў”. Іх Беларусь атрымае ў якасці міждзяржаўнага крэдыту на тэрмін да 10 гадоў.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за дадатковую фінансавую дапамогу і падкрэсліў, што гэтыя грошы “падтрымаюць эканоміку Беларусі ў найцяжэйшы час”, падтрымаюць абменны курс беларускага рубля. Таксама ён адзначыў, што рашэнне расійскага кіраўніцтва *“прынята не проста так”*. Паводле яго слоў, крэдыт дапаможа не толькі беларускай, але і расійскай эканоміцы з-за іх цесных сувязяў. Праўда, у такія прамовы даўно ніхто не верыць, таму застаецца пытанне: за што? За якія саступкі Расія дае Беларусі грошы на гэты раз?

Газета “Коммерсант” піша, што неагучаным засталося яшчэ адно падпісанае пагадненне — па вайскова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Расіяй. *“Гэта, можа быць, і ёсць сапраўдная цана пытання. Гэта менавіта тое, з-за чаго Аляксандр Лукашэнка кожны раз вяртаецца ў Маскву за перамогай”*, — адзначае расійскае выданне.



БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

Барыс ЖАЛІБА, прафесар, доктар эканамічных навук:

— Без крэдыту пытанне абвальнай дэвальвацыі было б вырашана, і сцэнарый 2011 года ў будучым годзе нам быў бы забяспечаны. Расія ў чарговы раз кінула беларускай эканоміцы выратавальны круг. Горш за ўсё тое, што гэтая валюта будзе выкарыстана так, як і раней, — грошы залічаць у золатавалютныя рэзервы. І яны будуць выкарыстаны ў першую чаргу для валютных інтэрвенцый на біржы, каб пакрыць дэфіцыт валюты, які ўзнікае з прычыны адмоўнага гандлёвага і плацежнага балансаў. Інакш кажучы, ужо ёсць намер праесці гэтыя грошы — выдаткаваць на бягучыя патрэбы. Тады як валюту трэба траціць на мадэрнізацыю, на капіталаўкладанні, на абнаўленне асноўных сродкаў нашых прадпрыемстваў, на тое, каб наша прадукцыя была больш канкурэнтаздольнай.

Здароўя, свабоды і грошай!

Віншуем Вас з надыходзячым Новым годам!
Няхай у 2014-м спраўдзяцца самыя смелыя мары і планы!
Няхай гэты год будзе шчодры на добрыя навіны!

Тацяна ДЗЯМ’ЯНАВА

З Новым годам!

Сябры мае! Віншую вас
З цудоўным святам — Новым годам!
Хай новы дзень і новы час
Змяце ў мінулае нягоды!

Хачу вам шчыра пажадаць,
Каб зззяла ў сэрцах вашых сонца,
А ў вашы душы благадаць
Лілася лёнымі бясконца!

Хай будзе ў сем’ях вашых мір,
І разуменне, і пяшчота,
Каб не нуды — кахання вір
Суправаджаў пачуццяў дотык!

Дай Бог здароўя вам збанок
Дый шчэ куфэрак весялосці,
Каб не зваліла стома з ног,
Пакуль да вас дадуць госці!

Жадаю ўдачы вам, свята,
Дабра, спакою, мудрай згоды —
Каб радасць шчырао была!
Жывіце ў шчасці! З Новым годам!

Нельга не падпісацца!

Можна не купіць бутэльку гарэлкі...
Можна адмовіцца ад дарагіх цыгарэт...
Можна, у рэшце рэшт, дзень-другі не паесці каўбасы...
Але нельга не падпісацца на “Народную Волю”, без якой, калі вы перастанеце яе атрымліваць, будзеце як без рук...
2014 год — год вялікіх падзей. І хто вам раскажа ***ПРАЎДУ,*** *як не “Народная Воля”?! Таму, калі вы яшчэ не падпісаліся на студзень—чэрвень, — хутчэй на пошту альбо ў любы спецыялізаваны пункт “Белсаюздруку”. Няма магчымасці аформіць падпіску на паўгоддзе — афармляйце на квартал, два месяцы, месяц... Потым працягнеце.*
Заўтра, 28 снежня, — апошні дзень падпіскі на першую палову 2014 года. Не спазніцеся!

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

ФОТАФАКТ

Навагодні сюрпрыз ад ДАІ



Напярэдадні Новага года гомельскія дзяржаўтаінспектары вырашылі парадаваць сябе і здзівіць усіх удзельнікаў дарожнага руху і ўсталявалі ля сцен абласной ДАІ ёлку ўласнай вытворчасці. 20 святлафораў адначасова гараць то жоўтым, то чырвоным, то зялёным сігналам, здзіўляючы пешаходаў і аўтамабілістаў.

ПАСТФАКТУМ

Змена архіпастыра

Як вядома, Мітрапаліт Філарэт адпраўлены “адпачываць”, кіраваць Беларускай праваслаўнай царквой прызначаны былі мітрапаліт Разанскі і Міхайлаўскі Павел.



Цікава, што кіраўнік праваслаўнай царквы Беларусі мітрапаліт Філарэт падаў прашэнне аб пенсіі яшчэ тры гады таму, калі дасягнуў 75-годдзя. Святы Сінод рускай праваслаўнай царквы жаданне шматгадовага першапастыра БПЦ сысці ў адстаўку задаволіў толькі 25 снежня гэтага года.

Прашэнне было разгледжана ў Сінадальнай зале афіцыйнай Патрыярхавай і Сінадальнай рэзідэнцыі ў Данілавым стаўрапагіяльным манастыры ў Маскве на апошнім у 2013 годзе пасяджэнні сінода. Мітрапаліт Філарэт на ім прысутнічаў асабіста.

У афіцыйным паведамленні прэс-службы патрыярха Кірыла гаворыцца, што сінод пастанавіў задаволіць прашэнне і “выказаць сардэчную падзяку правялебнаму Мітрапаліту Філарэту за 35-гадовае архіпастырскае акармленне Беларусі, якое адзначана выбітнымі царкоўнымі дасягненнямі, такімі як адкрыццё 10 дыяцэзій, шматразовае павелічэнне колькасці прыходаў, адкрыццё новых манастыроў, духоўных школ, усталяванне добразычлівага і канструктыўнага дыялогу з дзяржаўнай уладай і грамадскімі арганізацыямі, падтрыманне годнага ўзроўню міжканфесійных адносін, удзел у знешняй дзейнасці Маскоўскага Патрыярхата”.

Паводле рашэння сінода мітрапаліт Філарэт прызначаны ганаровым Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі з захаваннем права ўдзелу ў працы Святога Сінода і ганаровага пратакольнага месца на богаслужэннях і ў афіцыйных цырымоніях. Ён застанецца жыць у Беларусі, беларуская дзяржава абавязалася забяспечыць яму для гэтага ўсе ўмовы.

Кіраўніком Беларускай праваслаўнай царквы прызначаны мітрапаліт Разанскі і Міхайлаўскі Павел.

Мітрапаліт Павел (Панамароў Георгій Васільевіч) нарадзіўся 19 лютага 1952 года ў Карагандзе ў сям’і рабочых. Паходзіць з рэлігійнай сям’і, святаром быў ягоны дзед. Скончыў прафтэхвучылішча, працаваў шафёрам, слесарам, адслужыў у арміі. У 1973—1976 гадах вучыўся ў Маскоўскай духоўнай семінарыі. У 1980 годзе скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя.

Рашэннем Святога Сінода ад 19 лютага 1992 года быў вызначаны епіскапам Зарайскім, які кіраваў патрыяршымі прыходамі ў ЗША і часова ў Канадзе. У 1999 годзе прызначаны епіскапам Венскім і Аўстрыйскім. У 2001 годзе ўзведзены ў сан архіепіскапа з тытулам Венскі і Будапешцкі.

Рашэннем Святога Сінода ад 5—6 кастрычніка 2011 яму прысвоены тытул Разанскі і Міхайлаўскі, ён прызначаны кіраўніком новастворанай Разанскай мітраполіі. 8 кастрычніка 2011 года ўзведзены ў сан мітрапаліта.

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

Новый глава Белорусской православной церкви митрополит Павел прокомментировал свое назначение на эту должность:

— Для меня это очень большая честь. А с другой стороны — большая ответственность. Я с каким-то внутренним духовным трепетом воспринимаю эту новость, потому что быть епархиальным архиереем и Патриаршим Экзархом в Беларуси после митрополита Минского и Слуцкого Филарета… Я знаю, как его любят в Беларуси. После такого маститого иерарха Русской православной церкви быть вместо него — это очень и очень трепетно и очень ответственно.

КОГДА ВЕРСТАЛСЯ НОМЕР

Встречаемся на Рождество

Новый Патриарший Экзарх всея Беларуси Митрополит Минский и Слуцкий Павел намерен прибыть в Минск в начале января 2014 года.

“Владыка Павел намерен покинуть Рязанскую область (России) в конце следующей недели, перед Рождеством. 29 декабря в Христорождественском соборе Рязанского кремля новый митрополит Рязанский и Михайловский Вениамин и митрополит Минский и Слуцкий Павел совершат совместную Божественную литургию”, **— сообщили агентству “Интерфакс-Запад” в четверг в Рязанской епархии.**

ПАД ГРАДУСАМ

Еўрапейская зіма

Сёння, 27 снежня, надвор’е ў нашай краіне застанецца надзвычай цёплым, бо яго вызначаюць цёплыя вільготныя паветраныя масы, якія паступаюць з Чорнага мора.

Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор’е. Днём месцамі пройдуць невялікія ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу. У асобных раёнах магчымы туман, ноччу і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-ўсходні, парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе -2...+4°C, днём +1...+6°C, па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей паветра прагрэецца да +8°C.

У выхадныя ў Беларусі таксама захаваецца цёплае надвор’е. У суботу, 28 снежня, у асобных раёнах краіны пройдуць невялікія ападкі, ноччу і раніцай слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах -2…+3°C, днём 0…+5°C, па паўднёвым захадзе да +8°C.

У нядзелю 29 снежня кароткачасовыя ападкі чакаюцца ў дзённыя гадзіны толькі па паўночна-заходняй частцы краіны. Тэмпература паветра ўначы -2...+4°C , днём +1...+6°C, цяплей будзе па паўднёвым захадзе да +8°C.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ



Дзяніс РУТЭНКА, гандбаліст мінскага «Дынама» і зборнай Беларусі:

— 2013 — цудоўны год! Летам выйгралі ў зборнай Славеніі і патрапілі на чэмпіянат Еўропы.

А ў асабістым жыцці пакуль без змен. Я — халасцяк.

Што датычыцца наступнага года, то ўсім — толькі поспехаў!

Да сустрэчы 3 студзеня!

Шаноўныя чытачы!

У сувязі з тым, што сённяшні нумар “Народнай Волі” з’яўляецца апошнім з запланаваных на 2013 год, наступная наша сустрэча адбудзецца 3 студзеня 2014 года.

СКАНДАЛ

Дурдом!!!

Не, невыпадкова ў "шапку" гэтай падборкі вынесена слова "дурдом". Тое, што адбылося ў Слуцкім раёне, можна ахарактарызаваць толькі такім словам. У Казловіцкім Доме культуры сабралася невялікая група людзей, каб узгадаць гісторыю свайго краю, паглядзець фільм пра Слуцкае паўстанне, які раней дэманстраваўся па дзяржаўным тэлебачанні, пазнаёміцца з новымі дакументамі. І раптам урываецца нарад міліцыі на чале з маёрам Дзмітрыем Шклярэўскім... Што было далей? Аб гэтым расказ саміх удзельнікаў сустрэчы. Вядома ж, не абышлі мы бокам і "галоўных герояў" той сумнай, можна сказаць, трагічнай падзеі.

Дзе крамола?

Ініцыятарам прагляду фільма **"40 дзён сялянскай рэспублікі"**, які быў зроблены тэлеканалам АНТ і, натуральна, прайшоў адпаведную "ідэалагічную" праверку, была мясцовая актывістка **Зінаіда Цімошык**. Яна патлумачыла "Народнай Волі":

— Я з'яўляюся сябрам ГА "Таварыства беларускай мовы". Паколькі ў нас няма адпаведнага памяшкання, то ўсе мерапрыемствы мы, па сутнасці, ладзім пад адкрытым небам. Паколькі я яшчэ і настаўніца гісторыі, то часам праводжу экскурсіі па гістарычных мясцінах Случчыны. Мы нават агульную беларускую дыктоўку пісалі на каленях, бо нам не далі памяшкання. Нам увесь час кажуць, што ўсе дамы культуры працуюць адпаведна са складзеным графікам і там няма вольнага месца. Але ў лістападзе мы вырашылі зрабіць кінапаказ, мне пазваніла Ніна Стужынская, адзін з аўтараў фільма, і сказала, што ёсць такі кіналекторый і, калі ёсць жаданне, яго можна правесці ў Слуцку. Я пазваніла дырэктару Казловіцкага Дома культуры Аляксандру Туміловічу і спытала, ці можна правесці ў рамках ТБМ кіналекторый? Ён сказаў, што свабодныя памяшканні ёсць. Сказаў, што, калі нас будзе шмат чалавек, то тады можна будзе арандаваць памяшканне на рахунак выканкама. Калі ж нас будзе мала, то можна ўсё арганізаваць у малым пакоі і гэта будзе бясплатна. Тым больш што кіналекторый — гэта добра".

23 лістапада на прагляд фільма прыйшлі каля 20 чалавек. Як толькі Ніна Стужынская пачала сваю прамову, стала вядома, што міліцыя заблакіравала Дом культуры. Праз пару хвілін пагрукалі ў дзверы. На парозе з'явіўся мясцовы кіраўнік аховы правапарадку **Дзмітрый Шклярэўскі** з пытаннямі пра тое, хто адказны за правядзенне несанкцыянаванага мерапрыемства.

Зінаіда Цімошык працягвае:



— Я падняла руку, а потым прапанавала яму хаця б дзесяць хвілін пасядзець і паслухаць лекцыю. Сказала, што ён тады сам зразумее, што нічога крамольнага тут не адбываецца. Але ён сказаў, каб я выйшла з ім на разбіральніцтва, а іншым загадаў заставацца на месцы. Калі я выходзіла, то заўважыла, што ў будынку ўжо шмат міліцыянераў. Яны стаялі каля дзвярэй. У зале, куды мяне завёў Шклярэўскі, сядзеў чалавек у цывільным. Нас пакінулі сам-насам. Той, у цывільным, закінуў нагу на нагу і сказаў: "Ну вось мы і сустрэліся. Пагаворым?" А я пытаюся: "А вы хто такі?" Ён кажа: "З добраахвотнай дружыны..." Я адмовілася з ім размаўляць. Калі прыйшоў Шклярэўскі, сказала: "Можа, з вамі я яшчэ і паразмаўляю, але пры гэтым неапазнаным аб'екце нічога гаварыць не буду". Тады той, у цывільным, сышоў.

Зінаіда Цімошык прасіла не чапаць іншых людзей, бо пераважнай большасці з іх ужо за 70. Аргументы, што ў старых праблемы са здароўем, а такія працэдуры, як затрыманні і допыты, могуць выбіць іх з раўнавагі і тады наступствы для іх здароўя могуць мець самы негатыўны характар, на Шклярэўскага не паўплывалі. Як "паразмаўлялі" міліцыянеры з пенсіянерамі, можна ўявіць сабе з сухіх урыўкаў заяў апошніх у пракуратуру. **Пётр Марчанка**, у прыватнасці, піша: "*Мне 63 гады. Я не разумею, чаму нас затрымліваюць і не даюць нават выйсці ў туалет, паколькі мы нічога дрэннага не рабілі. Калі я выказаў сваё абурэнне, нейкі капітан сказаў: "Мы яшчэ з табой асобна пагаворым". У яго словах я адчуў пагрозу. Расхваляваўся, дома прыйшлося прымаць сардэчныя кроплі. Я старэйшы за гэтага капітана ў два разы і зварот на "ты" расцэньваю няйначай як абразу".*

А вось яшчэ адзін урывак з заявы іншага пенсіянера — **Міхаіла Казака**: *"Мне 77 гадоў. Нарадзіўся я ў 1936 годзе. У 1937-м Слуцкае НКВД расстраляла маю маці. У 1935 годзе быў арыштаваны мой бацька. Ніякіх супрацьпраўных дзеянняў яны не рабілі. Сваімі дзеяннямі слуцкая міліцыя нагадала мне тыя гады".*

Пры гэтым пратаколаў на пенсіянераў міліцыянеры не складалі, а вось Зінаіду Цімошык абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага мерапрыемства. Жанчына кажа, што ўся гэтая гісторыя нават з судом была дзіўная:

— Мне пазванілі з суда і сказалі, што заўтра, 12 снежня, у мяне суд. Я запытваю: "А што ж мне позву не даслалі?", а ў адказ: "А вы у пратаколе распісаліся, а там было напісана, што ў вас суд 12 снежня". Але на копіі пратакола, якую мне выдалі ў міліцыі, нічога такога не пазначана. Хто так робіць? А мне трэба было з'язджаць. Сказала, што ў мяне і квіток ёсць на цягнік. Так што я занесла ў суд заяву, каб пасяджэнне перанеслі. Дзесяць чалавек прыйшлі ў суд патрабаваць, каб мяне не судзілі завочна! Гэта ж так людзі былі ўражаны тым, што адбылося! Сядзелі, пакуль суддзя ***Святлана Пастухова*** *не выйшла і не сказала, што суд сапраўды пераносіцца. І* ***Мікалай Люшня****, які ў выніку ўсёй гэтай гісторыі ў цяжкім стане апынуўся ў бальніцы, быў разам з імі. Потым ён казаў, што быў вельмі расхваляваны; калі выйшаў з суда, дык пачаў хістацца, бо ціск вельмі падскочыў. Нават выбачаўся, што хутчэй за ўсё не зможа пайсці ў якасці сведкі, казаў, што хацеў у вочы зазірнуць і міліцыянерам, і суддзі... А потым вось інсульт...*

Але на суд прыйшлі іншыя. Людзі выступалі, абураліся, сарамілі міліцыянераў... Але іх як быццам не чулі. Вынікам пасяджэння стаў штраф у 20 базавых велічыняў (гэта 2 мільёны 600 тысяч рублёў). Фармальна Зінаіду Цімошык пакаралі за арганізацыю несанкцыянаванага мерапрыемства, а па сутнасці — за арганізацыю сумеснага прагляду фільма АНТ. Фільма, які да гэтага масава прагледзелі тысячы і тысячы тэлегледачоў! Зінаіда падала скаргу на дзеянні міліцыі, у якой пазначана, што насамрэч было культурніцкае мерапрыемства і адбывалася яно ў месцы, спецыяльна прызначаным для гэтага, — у Доме культуры. Прасіла спыніць адміністрацыйную справу — усё безвынікова.

Анамальная зона

Аргвысновы былі зроблены і ў дачыненні да дырэктара Дома культуры. **Аляксандр Туміловіч** у выніку розных разбіральніцтваў звольніўся "па дамоўленасці бакоў". 40-гадовы дырэктар (цяпер — былы) кажа, што папросту



"стаміўся ад сістэмнага маразму".

— Не ідэалогія вінавата, а людзі вінаватыя. Ну, напрыклад, я паказаў спектакль "Стомлены д'ябал" па Сяргею Кавалёву. Гэта сучасная беларуская драматургія. Я яго паказаў у Слуцку, і за гэта далі дыхту мне. Паехаў са спектаклем у Беразіно на фестываль, і там спектаклю далі Гран-пры. А ў Слуцку мне зноў забаранілі яго паказ. Забараняе ўсё намесніца старшыні гарвыканкама па ідэалогіі. А ў Салігорску просяць, каб прыехалі да іх зноў і зноў, — там спектакль не выклікае ніякіх пытанняў.

Чаму суд пагадзіўся з абвінавачваннем, з тым, што быў нейкі несанкцыянаваны сход? Што гэта?! Як гэта разумець?! Можа, тут, у Слуцку, нейкая анамальная зона?.. Мне сказалі, што я павінен быў узяць дазвол у начальніка на гэты кіналекторый. Дзе здаровы сэнс? Некаму, відаць, трэба было паставіць "птушку". Хацелі як лепш, а атрымалася..."

Аць-два!

Дык хто ж хацеў паставіць "птушку"? **Дзмітрый Шклярэўскі** сказаў, што не мае паўнамоцтваў нешта каментаваць у гэтай справе. Але не ўтрымаўся:

— Усё было ветліва, карэктна, а Зінаіда Вячаславаўна сама там да сябе ўвагу прыцягвала. Яе ўжо два гады нідзе не ўзгадвалі, вось... Што за кіно там было — пытанне ж не ў гэтым. Там было несанкцыянаванае мерапрыемства. Вось мы і дзейнічалі ў адпаведнасці з заканадаўствам. А што да Слуцкага збройнага чыну, то ў гэтай тэме, дарэчы, шмат нявысветленых пытанняў. Трэба ўзважана падыходзіць да гісторыі. Прэтэнзіі ў дадзеным выпадку не да фільма, а да парадку правядзення мерапрыемства. Няхай бы запрасіла Цімошык усіх да сябе на дачу ці на кватэру. А Дом культуры — гэта дзяржаўная ўстанова. Быў бы там нейкі план, у які мерапрыемства было б загадзя ўключана, то не было б ніякіх пытанняў. Дзяржаўны будынак — гэта не прыватная ўласнасць.

Разгон людзей, якія сабраліся ў Казловіцкім Доме культуры, каб разам паглядзець дакументальны фільм АНТ пра Слуцкае паўстанне, сапраўды можа скончыцца трагічна. Адзін удзельнік сустрэчы, пажылы чалавек, апынуўся на бальнічным ложку ў стане комы. Медыкі робяць песімістычныя прагнозы — мужчына можа і не прыйсці ў прытомнасць. 76-гадоваму Мікалаю Люшню стала кепска пасля таго, як ён пазнаёміўся з метадамі работы мясцовых міліцыянераў.

Любоў ЛУНЁВА.



Дзмітрый Шклярэўскі.

Ніна СТУЖЫНСКАЯ:

«Што, Дом культуры — рэжымны будынак?»

— Мы самі не чакалі такога рэзанансу, — *падзялілася думкамі з "Народнай Воляй" гісторык* ***Ніна Стужынская,*** *якая выступала адным з галоўных экспертаў у фільме пра Слуцкае паўстанне.* — Звычайна кожны год напярэдадні свята — Дня герояў — ладзілася грамадская імпрэза, у Слуцку склаўся такі асяродак накшталт фан-клуба, якім гэта ўсё цікава. На гэты раз я вырашыла паехаць на сустрэчу, каб пабачыцца з людзьмі і распавесці, якія новыя дакументы знайшліся пра гэтую падзею, і яшчэ раз паглядзець фільм, які выйшаў, здаецца, у пазамінулым годзе. Канешне, можна не пагадзіцца з некаторымі трактоўкамі гэтых падзей, але я лічу, што рэжысёр і сцэнарыст стужкі маюць права на сваё бачанне.



Калі ў Доме культуры ў Казловічах з'явіўся цэлы нарад міліцыі, я, шчыра кажучы, разгубілася. Дый не толькі я. Усім было незразумела, што здарылася і чаму раптам з'явіўся цэлы нарад міліцыі на чале з маёрам. Трэба ж было гэтым міліцыянтам кінуць Слуцк і прыехаць у гэтыя Казловічы...

На мой погляд, Слуцку проста сорамна хаваць сваю гісторыю, нават аб'яўляць гэтай славутай гісторыі нейкую вайну. Проста дзікунства нейкае! Пляскі на касцях... Увогуле, я гляджу, якое ў мясцовых улад стаўленне да гісторыі. Вось проста паглядзіце на гарадскія шыльды: "Вуліца Іваноўскага". Хто такі Іваноўскі, які мае гонар быць на гэтай шыльдачцы? Нават імя ягонага няма! Я, гісторык, не маю ніякага ўяўлення, якога Іваноўскага ўганаравалі ўлады, а што казаць пра іншаземцаў альбо проста тых людзей, якія мала цікавяцца гісторыяй свайго краю?..

Я спрабавала падысці да Слуцкага паўстання з абсалютна прагматычнага боку. Можна было б даўно распрацаваць маршрут па слядах гэтага паўстання, зацікавіць турыстаў, тым больш для Беларусі гэта лёсавызначальная падзея! Ёсць мясціны, ёсць сімвалы, факты, чаму гэтым не скарыстацца? Да нядаўняга часу быў жывы яшчэ сведка тых падзей, сын паўстанца, які ведаў пра гэтую падзею са слоў сваіх бацькі і маці. Не ведаю, чаму ўлады нічым не цікавяцца... Мне вось цікава, за што атрымлівае заробак ідэолаг у Слуцкім выканкаме? Калі ўсё пад забаронай — нават фільм, паказаны па дзяржаўным тэлебачанні, то чым людзям заняцца?..

Шкада было пенсіянераў, што прыйшлі на сустрэчу. Спачатку іх запалохалі, потым цягалі ў якасці сведкаў. Некаторыя, ведаю, захварэлі пасля такога стрэсу...

Уражанні ад суда ў мяне засталіся самыя дрэнныя. Суддзя Святлана Пастухова была не ў кепскім настроі, яна нават дазваляла сабе жарты накшталт таго, што *"вас жа там не білі".* Гэта быў такі чорны гумар з яе боку... Хаця... У нашай краіне не трэба сур'ёзнай нагоды, каб на тваю галаву міліцыянты апусцілі дубінку...

Але пры гэтым было заўважна, што тая ж суддзя Пастухова ўсё ж такі прачытала даведку пра тое, што такое Слуцкае паўстанне. Бо, калі нехта са сведак памыляўся, яна ўвесь час папраўляла: падзея адбылася ўвосень 1920 года.

Усё тое, што адбывалася ў зале суда, было дзіўным. Незразумела, як увогуле гэтая справа дайшла да суда! Бо няма за што прыцягваць людзей да адказнасці...

Спрабуючы асэнсаваць падзеі ў Слуцку, прыйшла да высновы, што ў нас існуюць дзве Беларусі — афіцыйная савецкая і неафіцыйная нацыянальная. І яны не могуць знайсці паміж сабой агульную мову. З другога боку, у мяне таксама шмат пытанняў і да прадстаўнікоў некаторых партый, якія, прабачце, бегаюць са сцягамі падчас святкавання Слуцкага паўстання. Людзям проста незразумела, з якой нагоды яны тут збіраюцца. Бо на гэтых мітынгах часцей за ўсё гавораць пра *"крывавы рэжым"* і *"імперыю зла".* У вачах звычайных случчан тыя, хто прыязджае са сцягамі, выглядаюць проста дзіўна. Бо палітычныя лозунгі вельмі далёкія і ад гістарычнай падзеі, і ад сённяшніх рэалій. І гэта паўтараецца з года ў год. Мітынгі ў апошнія гады вельмі малалюдныя. Кожная партыя ладзіць свой: адны збіраюцца ў адным месцы, другія — у другім. Было б смешна, калі б не было так сумна. Думаю, трэба палітыкам паклапаціцца пра тое, каб задаволіць цікавасць людзей да свайго мінулага і праз гісторыю дайсці да людзей.

Усе спасылаюцца на закон: маўляў, ён парушаны! Але яшчэ з курса паліталогіі вядома, што кожная ўлада стварае законы пад сябе. Я на судзе сказала: гэта Дом культуры, народны дом, чаму там нельга сабрацца? Для чаго ён тады пабудаваны і чаго ён абсалютна пусты па суботах, дзе людзі? І дырэктар Дома культуры, між іншым, быў толькі рады нашай ініцыятыве, бо існуе нейкі план па культурніцкіх мерапрыемствах, які ён павінен выконваць. Нават бальшавікі запрашалі людзей у хатычытальні: слухайце, вучыцеся! Гэта была адкрытая прастора для культурніцкай працы. А што зараз? Чаму нельга? Хіба Дом культуры — гэта рэжымны будынак? Ці гэта забароненае кіно?

Карацей, гэта проста дурдом! Няма ніякай логікі ў тым, што адбылося. Спрабуючы звесці адно да аднаго, прыйшла да высновы, што ўлады Слуцка — малапісьменныя, яны нічога не ведаюць і не хочуць ведаць пра сваю гісторыю і вельмі дрэнна ставяцца да тых, хто прагне ведаў. Карацей, гэтая гісторыя прадэманстравала ўвесь набор непавагі чыноўнікаў да сваіх грамадзян...

Марына КОКТЫШ.

ЭПІЛОГ ДРАМЫ

Аштрафавалі Зінаіду Цімошык, дырэктар Дома культуры Аляксандр Туміловіч звольніўся, а тыя восем старых, якія мелі праблемы са здароўем, але, дзякуй Богу, у шпіталь, як Мікалай Люшня, не трапілі, цяпер ходзяць у міліцыю. Пенсіянерам, калі яны звярталіся ў пракуратуру, нават не магло ў галаву прыйсці, што іх заявы накіруюць тым, на каго яны папрасілі знайсці ўправу. Не магло прыйсці людзям у галаву і тое, што за прагляд фільма АНТ іх затрымаюць, а жанчыну, якая іх запрасіла, яшчэ і пакараюць штрафам. Цікава, а што будзе, калі людзі збяруцца каля экрана, з якога транслюецца АНТ на Кастрычніцкай плошчы? Ці не стане "добрай" традыцыяй час ад часу высвятляць, хто там арганізатар прагляду, і браць адбіткі пальцаў у гледачоў?

Не вытрымлівае ніякай крытыкі і сцвярджэнне маёра мясцовай міліцыі Дзмітрыя Шклярэўскага наконт таго, што ў дзяржаўнай установе, якой, па яго разуменні, з'яўляецца сельскі Дом культуры, нельга праводзіць без санкцыі зверху такое мерапрыемства, як грамадскае абмеркаванне пытанняў, звязаных з гісторыяй роднага краю. Хутка чыхнуць людзям нельга будзе без дазволу нейкага раённага начальнічка. Абсурд!!!

Не, невыпадкова ў "шапку" падборкі вынесена слова "дурдом"!

P.S. *Калі нумар амаль быў гатовы да друку, стала вядома, што ў шпіталі, не прыходзячы ў прытомнасць, памёр Мікалай Люшня.*

ПАДЛІЧЫЛІ

Калійная вайна дорага абышлася беларускаму бюджэту

Ацаніўшы страты, нанесеныя былым гендырэктарам "Уралкалия" ў 100 мільёнаў долараў, беларускія ўлады недаатрымалі з-за калійнай вайны значна больш.

Даходы ад экспарту ў 2013 годзе ўпалі на 20 працэнтаў у параўнанні з папярэднім годам, у сувязі з чым дзяржаўны бюджэт недаатрымае каля 16 трыльёнаў рублёў. Пра гэта паведаміў намеснік міністра фінансаў **Максім Ермаловіч.**

"Сур'ёзна ўдарыла па бюджэце скарачэнне экспарту калійных угнаенняў з прычыны вядомых падзей і зніжэнне аб'ёмаў паставак расійскай нафты ў Беларусь. Сумарна гэтыя фактары прывялі да таго, што рэспубліканскі бюджэт у бягучым годзе недаатрымае каля 16 трыльёнаў рублёў", — падкрэсліў намеснік міністра. У эквіваленце страты раўняюцца прыкладна 1,7 мільярда долараў.

АФІЦЫЙНА

Апошнія дні

З 1 студзеня Вышэйшы Гаспадарчы суд Рэспублікі Беларусь спыняе сваё існаванне.

Як паведамляе прэс-служба ВГС, *"у сувязі з аб'яднаннем з 1 студзеня 2014 года Вышэйшага Гаспадарчага суда Рэспублікі Беларусь і Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь пачынаючы з 26 снежня 2013 года прыём карэспандэнцыі Вышэйшым Гаспадарчым судом спыняецца",* — гаворыцца ў паведамленні.

Аб'яднанне Вышэйшага Гаспадарчага суда і Вярхоўнага суда адбудзецца ў адпаведнасці з Дэкрэтам прэзідэнта Беларусі ад 29 лістапада 2013 года №6 "Аб удасканаленні судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь". Праўда, далёка не ўсе эксперты лічаць, што гэта разумны крок, бо прафесіяналізм суддзяў сістэмы гаспадарчых судоў спецыялістамі ацэньваецца вышэй, чым іх калег са звычайных судоў. Акрамя таго, існаванне Вышэйшага Гаспадарчага суда зафіксавана ў Канстытуцыі Беларусі. Таму многія юрысты проста не разумеюць, як можна было яго скасаваць, не змяняючы Канстытуцыі. Тым не менш Канстытуцыйны суд краіны ніякіх парушэнняў не бачыць.

УВАГА!

Болей бы такіх даручэнняў

29 снежня пройдзе адзіны дзень скідак.

Ва ўсіх гандлёвых аб'ектах краіны ў гэты дзень зніжкі складуць не менш за 15—20 працэнтаў "за кошт ўзгодненага зніжэння коштаў на нехарчовыя тавары арганізацыямі-вытворцамі і надбавак — гандлёвымі арганізацыямі".

Як паведаміла Міністэрства гандлю, такое даручэнне даў прэм'ер-міністр **Міхаіл Мясніковіч.**

Акрамя таго, кіраўнік урада даручыў Мінгарвыканкаму вырашыць пытанне з падоўжаным (кругласутачным) рэжымам работы гандлёвых аб'ектаў на 31 снежня ўключна.

ПРОГНОЗ

В 2014 году Беларусь ждут социальные потрясения

Исследовательский центр Economist Intelligence Unit (EIU) составил список стран, где есть вероятность возникновения социальных волнений в 2014 году.

Беларусь в нем указана среди государств с высоким риском протестов, пишет The Economist. Также в эту группу попали участники СНГ — Казахстан, Кыргызстан, Молдова, Таджикистан, Туркменистан и Украина. Большинство государств с "высоким" или "очень высоким" риском социальных потрясений в 2014 году — это страны Азии и Африки.

"Снижение доходов и высокий уровень безработицы не всегда сопровождаются беспорядками. Но если экономическим проблемам сопутствуют другие элементы уязвимости, возникает высокий риск нестабильности. К таким факторам относятся сильное неравенство в доходах, плохое управление, низкие уровни социального обеспечения, этническая напряженность и имевшие место ранее беспорядки. По-видимому, особое значение в возникновении беспорядков в последнее время имеет эрозия доверия к правительствам и институтам — кризис демократии", — говорит специалист Economist Intelligence Unit **Лаза Кекич.**

Исследователи напоминают, что во многих странах — таких как Украина, Болгария, Бразилия, Аргентина, Тунис, Египет и Турция — в последние двенадцать месяцев вспыхнули протесты. Даже традиционно более спокойные страны, такие как Япония и Сингапур, видели демонстрантов на улицах. Социальное неравенство и политическое недовольство побуждают граждан собраться вместе, а протест может координироваться намного легче "в век смартфона".

БУДЗЬЦЕ ГАТОВЫ!

З 25 студзеня...

...наймальнікі будуць праводзіць перадзменны медагляд работнікаў

Пра гэта паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны **Ігар Старавойтаў.** Па яго словах, з 25 студзеня 2014 года ў сілу ўступае новая рэдакцыя закона "Аб ахове працы". Згодна з унесенымі папраўкамі, наймальнік зможа ажыццяўляць перадзменны медыцынскі агляд або агляд у працэсе працы — у выпадках, калі ў дачыненні да работнікаў маюцца дастатковыя падставы меркаваць, што яны знаходзяцца ў стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення.

Калі работнік адмаўляецца ад праходжання медагляду, ён будзе адхілены ад працы без выплаты за гэты перыяд заработнай платы.

Пералік прафесій, якія падлягаюць абавязковаму медагляду, цяпер уключае каля 100 пазіцый: гэта работнікі, якія кіруюць транспартным сродкамі і грузапад'ёмнымі механізмамі, працуюць у горназдабываючай прамысловасці, працоўныя будаўнічых прафесій і іншыя.

ДЫПКУР'ЕР

Па візу Вялікабрытаніі — у Маскву?

Амбасада Вялікабрытаніі ў Мінску плануе закрыць візавы аддзел. Прыём заявак на візы ад беларусаў будзе збіраць камерцыйная структура.

Пра гэта паведамляе афіцыйны сайт амбасады.

"У рамках працэсу, які праводзіць Візавая і іміграцыйная служба Вялікабрытаніі, паўнамоцтвы візавага аддзела ў Мінску па прыняцці рашэнняў аб выдачы віз жыхарам Беларусі будуць перададзены буйному рэгіянальнаму цэнтру пасольства Вялікабрытаніі ў Маскве. З гэтай прычыны візавы аддзел пасольства ў Мінску будзе закрыты, і з сакавіка-красавіка 2014 года пачне працаваць Цэнтр па прыёме заявак пад кіраўніцтвам аднаго з камерцыйных партнёраў Візавай і іміграцыйнай службы Вялікабрытаніі, які будзе прымаць заяўкі на брытанскую візу ад жыхароў Беларусі ў Мінску. Мы праводзім кансультацыі з беларускімі ўладамі па гэтым пытанні. Больш падрабязная інфармацыя будзе вядома на пачатку наступнага года", — гаворыцца ў афіцыйным паведамленні на сайце пасольства.

ПЕЧАЛЬНАЯ ИСТОРИЯ

Беспаспортные

Мы, жители дома №146 военного городка "Уречье-2", хотим рассказать о приватизационной эпопее, которая началась еще в сентябре 2007 года и длится по сегодняшний день.

За шесть лет "поиска истины" написаны десятки заявлений личных и коллективных в районные, областные и республиканские инстанции, но воз и ныне там. Дело в том, что вышестоящие чиновники отсылают наши письма своим нижестоящим "братьям по-разуму", а те рассуждают просто: "Бог — высоко, Лукашенко — далеко, а свой карман — первое дело, проблемы простых людей — видели мы в глубокой "ПЕ-ЖО".

Все по порядку. Наш военный городок "Уречье-2" Любанского района в сентябре 1993 года был передан Слуцкой КЭЧ на баланс нашего райисполкома. Во время этой передачи "утрачены-потеряны" техпаспорта на все ДОСы военного городка. Прошло столько времени, а ни один дом не имеет техпаспорта.

В сентябре 2007 года мы получили письма от ГУ "Бобруйское ЭУ ВС" с информацией о порядке приватизации служебных жилых помещений по Указу Президента Республики Беларусь от 19.03.2007 г. №128. Все изложенные в данном письме требования мы исполнили, собрали необходимые документы, подали их в жилищный отдел Любанского РИК в декабре 2007 года. Но ни одна семья из нашего дома №146 не смогла воспользоваться этим указом, так как из-за отсутствия техпаспорта на наш дом оценочная стоимость квартир с целью приватизации равнялась 60 миллионам белорусских рублей (то есть 30 тысячам долларов в эквиваленте), а двухкомнатных — 40 миллионам (то есть выше цены МАПИДовской новостройки в районе Боровлян под Минском).

Откуда такая цена? Прилагаем к письму "Список стоимости домов г.п.Уречье-2 по состоянию на 1.01.1991 года. Это основной документ приема-передачи ДОСов на баланс Любанского РИК, по которому и рассчитывают стоимость квартир. Из таблицы видно, что два дома (№№145 и 146) имеют одинаковую площадь, но стоимость дома №146 в 2,5 раза больше, хотя они близнецы, строились армейским стройбатом под руководством прораба капитана Селиванова одновременно, к выводу советских войск из стран Варшавского договора (к нам пришли полки из Чехословакии под командованием полковника Чемериса). Оба дома панельные, типовой планировки, но дому №145 повезло больше — он строился первым, поэтому и качество домостроения лучше. Наш же дом скоропалительно возводили уже из того, "что было", панели битые, содержат множество трещин, во время дождя текут (фото прилагаю). Но по цене наш дом — как из золотых кирпичей!

Дома нашего военного городка построены в лесу, основные социально значимые объекты (больница, аптека, вокзал, сберкасса и т.д.) находятся в поселке на расстоянии примерно трех километров, общественного транспорта нет. Поэтому рыночная стоимость двух- и трехмнатных квартир колеблется в пределах 15—18 тысяч долларов.

Даже при том, что давали рассрочку по выплате стоимости приватизируемого жилья на 40 лет, для пенсионеров это издевка: дожить до ста лет, чтобы выплатить взнос за почти аварийное жилье. В ценах текущего года трехкомнатная квартира стоит 270 миллионов рублей, а двухкомнатная — 183 миллиона, однокомнатная - 110 миллионов, то есть как и в 2007 году — те самые 30.000 долларов, только уже по нынешнему курсу.

За 20 лет владения жилым фондом военного городка "Уречье-2" чиновники Любанского РИК не смогли (не захотели) обратиться в архив ГУС ВС РБ (г.Минск, ул.Азгура, 4), чтобы найти техническую документацию на наш дом. (Жаль, что дом строили не немцы во время войны, при их известной педантичности "Ordnung ist ordnung" нашлись бы не только техпаспорта и другая документация, но и процентовки и проектная стоимость дома, и все фамилии и подписи должностных лиц были бы на месте.) А тут — все утрачено, поэтому платите за "кривобокую панельку", как за двухэтажный таунхауз в США.


В нашем "золотом доме" протекающие во время дождя стены не единственная проблема. У нас канализационные коммуникации проложены стройбатом так, что когда колодцы переполняются, нечистоты всей системы стекают в наш подвал. За 20 лет эксплуатации дома они подмыли фундамент, в квартире №44 треснула внутренняя смежная стена между комнатой и туалетом, за которой находится большая чугунная труба канализационного стояка, она тоже лопнула (чтобы ее отремонтировать-заменить, пришлось писать заявление на имя председателя Любанского РИК, так как работники РУП "Любанское ЖКХ" ничего не могли сделать целый год!). Эта труба имеет контруклон, то есть ее положение не строго вертикально, знающие люди говорят, что в таком состоянии эксплуатация запрещена! А у нас квартира с текущими стенами стоит 270 миллионов рублей!

Последний раз "гейзер нечистот" зафонтанировал в подвале 30.09.2013 года. Обращение в местное домоуправление и в диспетчерскую службу ЖКХ ничего не изменило. Наконец-то в пятницу (4.10.2013 г.) удалось дозвониться до зампредседателя Любанского РИК по вопросам ЖКХ Сухана, который тоже ничем помочь нам не смог, так как была еще авария и в г.Любань, а спецмашина по очистке канализации одна на весь район. Правда, 5.10.2013 г. к концу дня "гейзер" бить перестал, однако ядовитые миазмы витали в подъездах еще несколько дней.

Горячая вода поступает в дома два раза в неделю: в пятницу и субботу. Иногда вода действительно горячая, но 22—23 ноября была только условно горячая. Цвет воды — буро-желтый. Возлагали большие надежды на станцию обезжелезивания, которую начали строить, но денег хватило только на красивый забор. При таком качестве жилой среды стоимость квартир с целью приватизации разве может быть 30.000 у.е.?

30 июля 2013 года в Любанском РИК прием вела С.И.Соколовская (работник службы госконтроля). Пробились к ней на прием, показали фотографии наших стен во время дождя, она дала поручение, чтобы создали комиссию и разобрались в этом вопросе.

8 августа 2013 года при температуре воздуха +35°С, когда над Беларусью стоял тропический антициклон, пришла комиссия из двух человек с фотоаппаратом фиксировать, "где у вас течет вода во время дождя"... Когда 12 июля шел дождь и текло не только в квартире №44, но и в квартире №73 и в квартире №18, а также и на лестничных клетках, то работников ЖКХ было не дозваться. Но потом работница местного домоуправления все же пришла, посмотрела, тихо ужаснулась и ушла (акт не составляла, так как приказа сверху не было).



Председателю Госконтроля
Республики Беларусь
жителей дома №146, расположенного
в военном городке Уречье-2,
Любанского р-на, Минской обл.

Заявление
20.07.2013г.

Уважаемый председатель, обращаются к Вам жители в/г Уречье-2 д. №146, просим оказать содействие в решении вопросов связанных с приватизацией жилья в нашем городке, приватизационная «эпопея» длится с сентября 2007 года (с момента получения нами писем от ГУ «Бобруйское ЭУ ВС»). ... трудности её связаны с тем, что на наш дом нет технического ... это значит — у дома нет паспорта, а с юридической точки зрения, ... собственника.

Слуцкая КЭЧ передала все ДОСы военного городка Любан... 1993 году (решение от 20.09.1993 г., ... прошествие 20 лет технические ... сделаны, что ...

Но не всегда работники Любанского РИК ведут себя инертно-пассивно. Иногда они проявляют чудеса оперативности. Тогда же, в 2007 году, когда никто не смог в нашем доме приватизировать квартиру, произошел случай, который демонстрирует молниеносно-быструю работу чиновников. В конце 2007 года умер одинокий человек, в собственности которого находилась трехкомнатная квартира на первом этаже дома №146. Прошло полгода, наследников не нашлось, и ЖКХ продает эту квартиру по цене коммунальной задолженности (чуть больше трех миллионов белорусских рублей) "своему человеку", который, сделав косметический ремонт, продает ее обратно Любанскому РИК по оценочной стоимости в 60 миллионов рублей. Отлично, купил за 1000 у.е., а продал за 30.000 у.е. Квартиру РИК купил для многодетной семьи. Спрашивается: почему же РИК не купил



И за квартиры в таком состоянии нужно платить десятки тысяч долларов?

эту квартиру для многодетной семьи по цене коммунальной задолженности (за 3.000.000 белорусских рублей)? Почему за такие "смешные деньги" не предложили это жилье бесквартирным очередникам, стоящим в очереди в местном сельсовете еще со времен СССР? Тогда бы не удалось чиновникам себе "позолотить ручку", а так — деньги на покупку жилья многодетным семьям казенные, их не жалко, что-то получил и посредник ("свой человек"), но большая часть, я предполагаю, досталась чиновникам.

Через два года, в 2011 году, собственница трехкомнатной квартиры №57 в этом же доме, вдохновленная хорошей оценочной стоимостью, какую дает РИК при покупке жилья, тоже решила продать свою квартиру многодетной семье. Но ее квартиру Любанский РИК оценил только в 16.000.000 рублей (то есть по курсу 2010 года чуть больше 5000 у.е.). Конечно, она от сделки отказалась, когда спросила, почему такая "бросовая цена", ей ответили, что согласно техпаспорту дома (значит, когда чиновникам надо — он находится!).

Мы пытались искать следы техпаспорта и в Слуцкой КЭЧ и Слуцком БТИ (именно туда возили хозяйку квартиры №57 для определения оценочной стоимости), но натолкнулись на интересный факт: на момент передачи ДОСов Слуцкой КЭЧ на баланс РИК Любани, Слуцка, Старых Дорог у них было два ДОСа под №146: один — в "Уречье-2", а второй — "генеральский" (так его назвала работница Слуцкого БТИ) в одном из военных городков Слуцка. Наверное, это кому-нибудь было нужно, чтобы под одним номером строили два дома? Возможно, поэтому балансовая стоимость дома №146 включает стоимость двух домов и поэтому в 2,5 раза больше стоимости аналогичного дома-близнеца под №145?

Все эти вопросы мы изложили в коллективном заявлении на имя председателя Любанского РИК и отдали в службу "Одно окно". Было это 25 октября 2013 года. Через месяц убедились, что правильно народ называет эту службу "одно окно — семь дверей". 27 ноября председатель Любанского РИК проводил прямую телефонную линию для граждан района. Поскольку прошел месяц с дня подачи нами заявления, а в ответ ни слуху ни духу, то 27.11.2013 г. мы дозвонились по "Горячей линии", но председатель сказал, что первый раз слышит о таком заявлении и в глаза его не видел. Для чего тогда барышни-чиновницы продержали его у себя целый месяц? Чтобы опять прислать нам очередную пустышку — отписку с подписями и печатями? Этих отписок у нас уже целая папка, так как за это время мы обращались в облисполком, Министерство ЖКХ, Госконтроль. Только Госконтроль прислал ответ, что наш вопрос поставлен на контроль, а облисполком и Министерство ЖКХ все "спустило" обратно на Любань.

Приведу пример, который иллюстрирует работу чиновников с обращениями граждан. В 1993 году, когда Беларусь еще не была президентской республикой, уволенный из ВС по сокращению штатов прапорщик никак не мог получить у нас в городке квартиру, хотя дома уже были в собственности местных Советов и своим "сватьям-братьям" чиновники квартиры давали. У него на руках было требование о первоочередном обеспечении жильем, мало того, он год прослужил в Афганистане, но его даже на очередь не хотели поставить в местном сельском Совете. Тогда написали письмо на имя тогдашнего председателя Верховного Совета С.Шушкевича, в котором изложили суть вопроса. Надо отдать должное той власти — за десять дней вопрос решился положительно, человек получил жилье.

Теперь А.Лукашенко заговорил о том, чтобы перевести все жилье, которое не приватизировано, в арендное. Но, повторяю, на наши дома техпаспортов нет, то есть юридически городок не существует. Здесь проживает 1000 человек, но мы **"город(ок), которого нет"!**

Опять же, как будет определяться арендная плата? Неужели в Уречье она будет такой же, как в минском Уручье? Но здесь, в Уречье, и уровень зарплат, и качество жилой среды, и качество услуг ЖКХ с Минском не сравнить.

Если есть возможность напечатать наше письмо, сделайте это. Может, хоть публикация в "Народной Воле" заставит чиновников вникнуть в нашу проблему.

От имени 20 ответственных квартиросъемщиков дома №146 в/г "Уречье-2" Любанского района Минской области —

Людмила Анатольевна МАНКЕВИЧ.
Любанский район.

Зачем сидеть дома?

Белорусская железная дорога сообщает о дополнительных поездах в дни новогодних и рождественских праздников.

В межрегиональном сообщении добавятся поезда: №638/637 Минск—Гомель (отправление из Минска 28, 29, 30 и 31 декабря), №632/631 Минск—Гомель (отправление из Минска 28, 30 и 31 декабря, 2, 4 и 7 января), №635/636 Минск—Пинск—Брест (отправление из Минска 29 декабря), №668/667 Гродно—Минск (отправление из Гродно 30 и 31 декабря). Межрегиональные дополнительные поезда также будут курсировать по маршрутам Брест—Могилев, Минск—Полоцк, Брест—Барановичи, Брест—Орша, Брест—Гомель.

В международном сообщении БЖД совместно с Российскими железными дорогами дополнительно назначены поезда по маршрутам Минск—Москва, Брест—Москва, Минск—Санкт-Петербург и другие.

АФІЦЫЙНА

ААН абавязала Беларусь змяніць «Закон аб масавых мерапрыемствах»

Такія патрабаванні ўтрымліваюцца ў адказе з Камітэта па правах чалавека ААН, які атрымаў гомельскі праваабаронца **Леанід Судаленка.**

Перапіску з Жэневай па гэтай справе Судаленка пачаў яшчэ ў 2008 годзе. Тады два актывісты руху "За Свабоду" былі аштрафаваны за тое, што раздавалі ўлёткі з запрашэннем наведаць сустрэчу з Аляксандрам Мілінкевічам. Прайграўшы некалькі судоў у Беларусі, Судаленка звярнуўся ў Камітэт ААН. Канчаткова справу разгледзелі толькі ў лістападзе 2013 года. Зараз Беларусь павінна ўнесці змены ў закон "Аб масавых мерапрыемствах", кажа праваабаронца:

"Самае важнае, гэта рашэнне агульнае, датычнае да ўсіх. Камітэт па правах чалавека ААН абавязаў Беларусь унесці змены ў заканадаўства такім чынам, каб яно не перашкаджала грамадзянам арганізоўваць мірныя сходы і заклікаць на іх".

Акрамя гэтага, беларускія ўлады павінны кампенсаваць аштрафаваным актывістам усе страты і паведаміць пра ўнесеныя змены Камітэту па правах чалавека ААН. Праўда, гэтага пакуль не здарылася.

АФЕРА

Псевдо-целительница

В Гродно возбуждено уголовное дело по факту мошенничества через интернет.

Как рассказал сотрудник пресс-службы УВД Гродненского облисполкома **Игорь Белозеров,** мошенник выманил более 500 долларов. Аферист втерся в доверие к 42-летней жительнице областного центра, пообещав излечить ее мать. Он действовал под видом целительницы из Украины, якобы способной на расстоянии избавлять от различных недугов. Когда мошенник перестал выходить с доверчивой гродненчанкой на связь, а матери лучше не стало, пострадавшая от действий "целительницы" обратилась в милицию.

УПЕРШЫНЮ

Папа Францішак папрасіў беларусаў маліцца за яго

і даслаў першы ў гісторыі Касцёла дакумент на беларускай мове

"Спадарыні Ядвізе Пастэрнак з удзячнасцю за ўсё тое, што Вы зрабілі і робіце для Касцёла. Прашу Вас маліцца за мяне. Няхай Пан Бог Вас благаславіць, а Багародзіца Вас аберагае. Францішак", — піша Святы Айцец.


Папскі дакумент уручыў беларускай верніцы Апостальскі Нунцый у Беларусі арцыбіскуп Клаўдыа Гуджэроці падчас візіту ў парафію Узвышэння Святога Крыжа ў Вілейцы 22 снежня.

Ядвіга Пастэрнак нарадзілася 6 красавіка 1927 года ў вёсцы Муляры ў 35 км ад Вілейкі і жыве ў гэтай вёсцы да сённяшняга дня. Была дзявятым дзіцем у сям'і. Яе бацькі былі простымі вясковымі людзьмі, бацька быў краўцом, ад яго Ядвіга вучылася кравецкай справе і працавала ўсё жыццё швачкай. Выхоўвалася ў глыбока рэлігійнай сям'і. Да Першай святой Камуніі яе рыхтавалі сёстры-непакалянкі з Вішнева. Скончыла пачатковую школу, дзе навучылася чытаць і пісаць на польскай мове. У 7 гадоў пакалечыла нагу, разбіўшы чашку на калене, і гэтая хвароба дае аб сабе знаць усё жыццё, стаўшы для яе сапраўдным крыжам. Замуж пайшла ў 58 гадоў за ўдаўца, глыбока веруючага і пабожнага чалавека, і пражыла з ім 9 гадоў.

У 1934 годзе ў суседняй вёсцы Дубава была пабудавана капліца, куды рэгулярна прыязджалі святары: ксяндзы Хомскі, Пётр Война-Уранскі і Цімашкевіч. Ядвіга ўспамінае, што ксёндз Хомскі прыязджаў з Вішнева на кані, а Пётр Война-Уранскі — на матацыкле. Нягледзячы на калецтва, Ядвіга з 7-гадовага ўзросту наведвала гэтую капліцу, ішла пешшу, абапіраючыся на самаробныя мыліцы, часамі яе падвозілі вяскоўцы. Капліца праіснавала да 1963 года, пасля была разабрана і перавезена ў Іжу, з яе зрабілі бальнічную кухню. Калі капліцу разабралі, крыж скінулі з вежы, і ён, пагнуты, застаўся ляжаць на ўзгорку, дзе была капліца. Праз нейкі час Ядвіга падабрала яго, прыклала намаганні, каб адрамантаваць, і зберагла да сённяшніх дзён. Калі ў Куранцы ў 2011 годзе з'явілася капліца, яна перадала яго туды.

Пасля вайны па святах Ядвіга хадзіла ў касцёл у Вішневе, які знаходзіўся на адлегласці 18 кіламетраў. Скалечаная нага стварала вялікую цяжкасць у рухах. Ідучы, яна вымярала адлегласць ад слупа да слупа і спынялася, каб адпачыць, пры гэтым мыліцамі мазоліла да крыві рукі. Найчасцей дабіралася ў Вішнева вечарам, начавала ў знаёмых і раніцай ішла ў касцёл. Для тых, хто не меў магчымасці быць у касцёле, прыносіла аплаткі, асвечаныя велікодныя стравы і ваду, хлеб Святой Агаты. Дзяцей, якія жадалі прыняць Святую Камунію, ксёндз Юзаф Кісель, пробашч Вішнева пасля вайны, накіроўваў да Ядвігі Пастэрнак, якая іх рыхтавала. Яна ад рукі перапісвала катэхізіс і раздавала дзецям. Сама карысталася кніжачкамі, якія мела з дзяцінства, са школы сясцёр-непакалянак, і якія захоўвае да сённяшняга дня.

У 1970-х гадах па маршруце Маладзечна—Свір праз Муляры стаў хадзіць аўтобус, і гэта дазволіла Ядвізе ездзіць на імшу ў Шэметава,



дзе служыў ксёндз Станіслаў Кучынскі.

Пачынаючы з 1949 года Ядвіга разам з іншымі парафіянамі хадзіла на пахаванні, спявала, малілася, перад пахаваннем акрапляла асвечанай вадой магілу. Гэта ў той час была адзіная магчымая хрысціянская форма пахавання. Яна малілася за католікаў і праваслаўных, за ўсіх, да каго яе запрашалі, і можна сказаць, што пахавала такім чынам цэлыя вёскі вакол Муляраў.

Пасля адкрыцця касцёла ў Вілейцы Ядвіга пачала ездзіць туды і наведвае гэтую святыню да сённяшняга дня.

У сваёй вёсцы Муляры і акрузе яна змагла сабраць людзей у супольнасць, дзякуючы чаму магчыма было арганізаваць правядзенне імшаў перад вялікімі святамі, была арганізавана душпастырская візітацыя (каляда), апека над састарэлымі, хворымі і паміраючымі як па вёсках, так і ў доме-інтэрнаце ў вёсцы Іжа, служыла дапамогай сем'ям у правядзенні каталіцкага пахавання.

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

Парламент Літвы абвясціў 2014 год Годам Аршанскай бітвы


Адпаведны законапраект быў ініцыяваны групай парламентарыяў, якія належаць да розных фракцый.

У пастанове сцвярджаецца, што рашэнне прынята з улікам таго, што ў наступным годзе ў верасні споўніцца 500 гадоў з моманту "гістарычнай перамогі Вялікага Княства Літоўскага" ў бітве пад Оршай і абароны тэрытарыяльнай цэласнасці літоўскіх земляў". Па словах ініцыятараў ідэі, "Бітва пры Оршы з'яўляецца адной з вялікіх перамог Літоўскай арміі пасля Грунвальдскай бітвы і гэта надзвычай важная дата для літоўскай гісторыі".

"Перамога ў бітве пад Оршай, здабытая ў абароне тэрытарыяльнай цэласнасці Літвы супраць значна большай арміі (амаль у тры разы) дазволіла Літве заключыць перамір'е, якое амаль на 40 гадоў забяспечыла мір у дзяржаве", — гаворыцца ў тлумачальным лісце.

Сваёй пастановай сейм Літвы абавязаў урад падрыхтаваць праграму урачыстасцяў, звязаных з гадавінай бітвы.

Нагадаем, што бітва пад Оршай адбылася 8 верасня 1514 года падчас чарговай вайны з Маскоўскім княствам, калі маскоўскія войскі спрабавалі захапіць тэрыторыю сённяшняй Беларусі і Літвы. Адным з галоўных герояў Аршанскай бітвы быў гетман Канстанцін Астрожскі. Менавіта ён быў на чале 30-тысячнага беларускага войска, якое цалкам разбіла 80-тысячную маскоўскую армію. Адзначаць 8 верасня як Дзень беларускай вайсковай славы пачалі толькі ў канцы 1980-х. А ў 1992 годзе ў гадавіну вялікай бітвы на плошчы Незалежнасці ў Мінску беларускія афіцэры ўрачыста прынялі прысягу на вернасць роднай краіне і народу. 8 верасня 1992 года ў Мінску былі прыведзены да прысягі 12 афіцэраў і 3000



Найвышэйшы гетман ВКЛ Канстанцін Астрожскі. Мастак Мікола Купава.

салдат запасу. Тады ўдзельнікі гэтай прысягі падвяргаліся ціску з боку ўлад, але праз вельмі кароткі час прысягу на вернасць Беларусі прынялі ўсе вайсковыя часці. Праўда, сённяшняя афіцыйная Беларусь славутую перамогу не адзначае.

НА ЗАМЕТКУ

Ценник вырос

Под занавес года изменились предельные максимальные тарифы на консультации врачей-специалистов терапевтического и хирургического профилей.

К специалистам терапевтического профиля относятся, к примеру, терапевт, педиатр, врач функциональной диагностики, реабилитолог, эндокринолог, невролог, аллерголог и другие. К хирургии — окулист, эндоскопист, уролог, гинеколог, отоларинголог, хирург и т.д.

В соответствии с постановлением Министерства здравоохранения, максимальные тарифы на консультации врачей-специалистов вышеуказанных профилей, в том числе сотрудников кафедр, имеющих категории, ученую степень, научное звание, для граждан Беларуси составят:

врач-специалист второй квалификационной категории — 67 тысяч рублей;

врач-специалист первой квалификационной категории — 70 тысяч рублей;

врач-специалист высшей квалификационной категории — 72 тысячи рублей;

врач-специалист, кандидат медицинских наук — 117 тысяч;

врач-специалист, доктор медицинских наук — 137 тысяч;

доцент, кандидат медицинских наук — 128 тысяч;

профессор, доктор медицинских наук — 149 тысяч;

член-корреспондент Национальной академии наук Беларуси, доктор медицинских наук — 170 тысяч;

академик Национальной академии наук Беларуси, доктор медицинских наук — 193 тысячи рублей.

Изменения прейскурантов в медучреждениях страны вступают в силу после католического Рождества.

Здоровья вам в новом году!

ГАЗЕТА—ЧИТАТЕЛЬ

Хочу поблагодарить Вас...

Хочу поблагодарить коллектив редакции и особенно главного редактора И.П.Середича за прекрасную газету, которую выписываю и читаю от корки до корки.

Выражаю большую благодарность и восхищение умом, талантом и мудростью Светланы Калинкиной за ее прекрасные статьи. Она воистину может быть президентом нашей многострадальной страны. Желаю всему коллективу газеты здоровья, радости, успехов в Вашем благородном деле — нести людям правду! Поздравляю всех Вас с наступающим Новым годом!

Т.Е.КОШЕВАЯ.

Минск.

ОТ РЕДАКЦИИ

Что и говорить, приятно читать такие строки. Но мы прекрасно понимаем, что с нашей стороны есть и промахи, и недоработки. Не всегда мы на высоте при разработке той или иной острой проблемы. Словом, "Народная Воля" может быть еще более интересной, более содержательной. И в 2014 году мы, уважаемая наша читательница, будем стараться оправдать Ваши теплые слова, которые, считаем, Вы подарили нам авансом.

МЫСЛИ ВСЛУХ

«Донашиваем вещи 20-летней давности...»

После войны в колхозах за год можно было заработать полтора-два мешка неочищенного зерна. В 1950-х годах на трудодень стали начислять по шесть копеек — за год выходило около 25 рублей. На них можно было несколько раз поесть в столовой. Моя бабушка, доярка, и тетя, свинарка, за год работы на двоих получили ведро сахара и ведро подсолнечного масла... И когда в начале 1960-х в колхозах стали выдавать паспорта, вся молодежь ринулась в города. Родители говорили детям: "Беги отсюда, сынок (или доченька)!". Никакого имущества они не могли им дать, дети уезжали в том, в чем были одеты...

Сейчас фактически происходит то же самое, что и после войны. Вырастают дети, а родители из-за бедности не могут построить им дом, в деревне работа тяжелая, зарплата низкая. И молодежь, которая едет за границу в поисках лучшей жизни, не может остановить никто — ни местные власти, ни репрессивный аппарат.

У нас с женой за десятки лет работы был накоплен вклад. В деревне погибла мать моей жены, оставив нам корову. У нас было 7200 рублей — это 9 коров! Когда сын пришел из армии, вклад украли, несмотря на обещания компенсировать его телевизорами, холодильниками, автомобилями. Мы с женой в материальном плане ничего не могли дать сыну, и он поехал на работу в Россию. Сами из вещей, кроме трусов и носков, фактически ничего не покупаем — донашиваем вещи 20-летней давности или с чужого плеча.

Кому понравится такая жизнь?..

Вот поэтому и уезжают из Беларуси люди...

Тимофей МАКАРЕНКО.

Витебск.

АКТУАЛЬНАЯ ТЕМА

Как противостоять автомобильному налогу?

Уверен в том, что вопрос о введении нового налога (или пошлины) на допуск к дорожному движению транспортных средств не безразличен многочисленным владельцам автомобилей и мотоциклов.

Отстегивать в казну придется не так уж и мало: постоянное повышение цен на топливо, на ежегодное прохождение техосмотра, страхование... Да и сама по себе эксплуатация автомобиля (запчасти, расходные материалы, косметика и т.п.) обходится владельцу в приличные суммы и не компенсируется государством.

Фискальная политика нашего государства особенно досаждает пенсионерам, которым содержать автомобиль становится все накладнее, а ведь в большинстве своем эта категория владельцев транспортных средств использует их не для праздного катания. Они ездят на дачи и в дешевые магазины за покупками, в деревню или в город к родственникам.



Протесты против очередного "сравнительно честного отъема денег" у населения носят в большей степени эмоциональный характер. Рационального противодействия принятию такого закона почти не предлагается. Между тем ситуация даже в нынешних условиях нашей "демократии" не выглядит безнадежной. Причем механизм противодействия прописан в действующих законах и не требует каких-либо сверхусилий со стороны заинтересованных граждан, тем более агрессивного реагирования.

Поскольку в Конституции Республики Беларусь записано о народовластии и осуществлении его через выборных его представителей, то ***каждый гражданин или группа граждан имеют законное право обратиться к своему представителю в органах власти — депутату — с требованием инициировать рассмотрение в парламенте данной ситуации и голосовать за отмену соответствующего закона о введении нового налога.***

В любом случае такое письменное (обязательно!) обращение не может быть проигнорировано депутатом Национального собрания, на него должен быть дан ответ, если это индивидуальное обращение, или же отчет депутата на встречах с избирателями. Эти нормы содержатся в законах о статусе депутата, об обращениях граждан.

Вот тогда мы узнаем, в чьих интересах работает наш депутат, является ли он поистине "народным" или же это деталь машины для голосования в навязанной нам системе власти, именуемой вертикалью, поскольку его обязанность отчитываться перед избирателями о том, как он голосовал за тот или иной закон.

Улучшение качества наших дорог следует, особенно в Год бережливости, начать со строгого соблюдения технологии при их ремонте и строительстве, поскольку класть покрытие зимой и в дождь абсолютно недопустимо. Также повсеместно распространены случаи, особенно в конце года, когда надо во что бы то ни стало освоить выделенные из бюджета целевые средства (а иначе на следующий год их не выделят). Ямочный ремонт дорог в XXI веке при помощи лопаты и катка выглядит пещерным анахронизмом, и его качество предсказуемо.

Искать средства пополнения бюджета путем обдирания не очень богатого населения в общенародном государстве не тот путь, любви к инициаторам таких новаций не прибудет, а социальное напряжение в обществе будет усиливаться.

Те же самые депутаты, если они и радетели о государственных интересах, и выразители воли электората, должны как раз и прислушиваться к мнениям и предложениям их избравших, а то наше народовластие только и сводится к походам на избирательные участки в объявленные дни, а дальше народ и его избранники существуют сами по себе.

Влад СТАНИС,
пенсионер, адвокат,
ветеран труда.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

І ў наступным годзе дыктатуры годзе

"Я так разумею, Лідзія Міхайлаўна (*старшыня Цэнтрвыбаркама Ярмошына.* — **А.Н.**), перыяд дыктатуры заканчваецца, надыходзіць этап дэмакратыі, ад гэтага нікуды не дзецца. З наступнага года!"

Аляксандр Лукашэнка.

На шчасце, падарункі ў свята
Дае не толькі Дзед Мароз.
На гэты раз і родны Тата
Нам вестку добрую прынёс.
Сваю "Снягурку" ён паклікаў,
Цэнтрвыбаркама старшыню,
І мовіў з радасцю вялікай:
— Я ні на ёту не зманю,
Калі паведамлю навіну,
Якая ўзрушыць грамаду:
Зраблю я вольнаю краіну
І дэмакратыю ўвяду!
Народу дыктатуры годзе,
Бо ён хмурнее з кожным днём.
Дык ведай: у наступным годзе
Мы "рассупоньваць" і пачнём...
Не верыла вушам "Снягурка",
Як быццам ёй сказаў вар'ят:
Без дыктатуры, без падмурка
Адразу ж рухне існы лад.
Нарэшце трохі ачуняла:
— Лічыцьмем галасы як след,
Дык шанцаў будзе вельмі мала
На выбарах — то не сакрэт...
— Хай выбіраюць хоць Лябедзьку
Ці хоць самога Пазьняка!
Мне ўсё адно, ці хрэн, ці рэдзька
Тут будзе за кіраўніка...
І вось пра змест тае размовы
Дазналіся ў краіне ўсе.
— Спадарства! Год наступны, новы
Нам перамены прынясе!
Улада стала на карачкі! —
Разнёсся кліч ва ўсе куткі. —
Дык абуджайцесе ад спячкі
І з нор вылазьце, пазьнякі!
І акрыялі дэмакраты,
І сярод іх раздрай узнік:
Каго на трон заместа Таты?
Хто з іх найлепшы кіраўнік?
А хто-ніхто з наменклатуры
Прыкідваў: "Калі сыдзе Ён,
Калі не будзе дыктатуры,
Дык можа й мне сягнуць на трон?"
Здалося ўсім найболей смелым,
Што наступае рай зямны,
І сцягам бел-чырвона-белым
Ужо размахвалі яны.
Спадзеў займелі палітвязні
(Свабода ў іх заўжды наўме),
Што хутка будуць мыцца ў лазні,
А не пад кранам у турме.
У радасці — газет пісакі:
Не трэба люд дурыць маной,
Апісваць-славіць хлуд усякі,
На паласе "варочаць гной".
Сябе адчулі вельмі хвацка
Усе высокія чыны:
Да іх не зможа болей Бацька
Звяртацца, быццам да шпаны.
Не змусіць больш пагляд суровы
Чакаць, куды закіне лёс,
Не трэба больш схіляць галовы,
Бо не адбудзецца чарговы
На ўвесь тэлеэкран разнос.
Ды што казаць! Расправіў грудзі,
Памаладзеў і сам прэм'ер:
Прылюдна больш ніхто не будзе
"Шпыняць", як хлопчыка, цяпер.
Ад бізнесоўца да банкіра
І ад старых да дашкалят
Навінай цешыліся шчыра:
Больш не паўторыцца дыктат!
У свет расчыненыя дзверы,
Не трэба больш крычаць: "Сыходзь!"
І ўдзячны Бацьку люд без меры —
Паслабіў лейцы дабрахоць.
І ад такой шчаслівай былі
(Каб выказацца, мала слоў),
Калі куранты гулка білі
І людзі ўсталі з-за сталоў,
Калі не бачна твараў шэрых,
Калі надзеі — навырост,
Ва ўсіх дамах, ва ўсіх кватэрах
"За Бацьку!" — быў найпершы тост.

* * *

Дарма народ паверыў Бацьку...
Пры беспрасветнасці жыцця
Пад Новы год падкінуў цацку —
"Няхай пацешыцца дзіця".
Калі расказваў аб рашэнні —
Салодкім, смачным, як халва,
Трымаў ён кукіш у кішэні!
А можа, і адразу два...

СИТУАЦИЯ

Более десяти лет назад на крыше центральной районной больницы городского поселка Хотимск были установлены четыре мачты сотовой связи. В то же время...

"Новое исследование русского ученого Игоря Беляева и турецкой исследовательницы Несрин Сейхан показывает, что излучение от мобильных устройств может повреждать ДНК и нарушать процесс репарации ДНК", — сообщают СМИ.



Несмотря на то, что влияние электромагнитного излучения на человека до конца не изучено, но уже сейчас ученые констатируют факт, что в целом, если проанализировать результаты исследований, да, опасно.

И вот в г.п. Хотимск все это время такое огромное электромагнитное излучение давит на всех, кто находится в данном социально значимом учреждении — центральной районной больнице.

Можно понять ситуацию, когда такие мощные передатчики установлены на административных зданиях, где работающие в них люди находятся не более восьми часов в сутки с двумя выходными днями в неделю. Но совсем другая ситуация, когда больные на протяжении всего периода нахождения в больнице подвергаются данной экзекуции 24 часа в сутки.

Установлена закономерность увеличения числа сердечно-сосудистых, онкологических и желудочно-кишечных заболеваний. Видимо, в связи с этим у нас было закрыто родильное отделение. В течение двух лет разбежались все молодые врачи.

По моему твердому убеждению, это жесточайший эксперимент над жителями Хотимского района.

Валерий КОРОНКЕВИЧ.

г.п.Хотимск.

ДЫСКУСІЯ

Мы не гатовы да эўтаназіі

Узяцца за пяро мяне прымусіў артыкул "Эўтаназія даўно грукае ў нашы дзверы" Б.Забалосніка, надрукаваная ў "Народнай Волі" 6 снежня 2013 года.

Не магу пагадзіцца з аўтарам.

Жыццё чалавека — самая вялікая, самая дарагая каштоўнасць, якая ёсць у яго, з-за якой ён гатовы пераносіць боль і розныя пакуты.

Я працаваў у медыцыне 57 гадоў. За гэты перыяд даводзілася лячыць розных людзей — і па ўзросце, і па характары. З многімі з іх на працягу доўгага часу прыходзілася быць у кантакце. Гэтая акалічнасць, думаю, дае мне падставы і права сцвярджаць, што прага жыцця ў чалавека неадольная. Чалавек з непарушанай псіхікай ніколі не будзе сур'ёзна прасіць аб эўтаназіі.

Задача медыцыны ў тым, каб аблегчыць чалавеку боль і ягоныя пакуты, каб захаваць і падоўжыць яго жыццё. Задача грамадства забяспечыць яму догляд і стварыць умовы, у якіх ён не будзе адчуваць сябе адзінокім. На гэта павінны накіроўвацца ўсе сілы і намаганні, і толькі ў выпадку, калі, нягледзячы на ўсё гэта, не ўдаецца рашыць пастаўленую задачу, калі акажацца, што рашыць яе немагчыма па аб'ектыўных прычынах, урач можа дазволіць сабе пайсці насустрач хвораму і паставіць пытанне аб эўтаназіі.

Я лічу, што на сённяшні дзень у Беларусі не можа быць дазволена эўтаназія. Для гэтага патрэбны вельмі высокі ўзровень агульнай і асабістай культуры людзей.

Рашэнне аб эўтаназіі павінен прымаць не лечачы ўрач, а незалежная аўтарытэтная камісія, здольная аб'ектыўна ацаніць стан хворага і ўсе звязаныя з гэтым абставіны. А хворы сваю просьбу аб эўтаназіі павінен пацвердзіць уласным подпісам. Калі зрабіць гэта ён не ў стане, камісія, што прымае рашэнне аб эўтаназіі, павінна ўлічваць гэты факт. Інакш дазвол на эўтаназію могуць скарыстаць розныя прайдзісветы і жулікі для дасягнення пэўных мэт.

Надрукаваны артыкул Б.Забалосніка не можа не выклікаць абурэння. Аўтар яго з нейкім пафасам заклікае да эўтаназіі, расцэньваючы гэтыя заклікі як праяўленне гуманных адносін да хворага. Але мне падаецца, што аўтар падманвае сам сябе. Бо няма ў гэтым ніякага гуманізму.

Яўген Васільевіч ДЗІСКО.

Мінск.

БЕЗ РЕТУШИ

Не ломайте копий

Уважаемая редакция!

Прочитал письмо "Лидию Ермошину к уголовной ответственности!", опубликованное 29 октября, и не знал, что делать: то ли смеяться, то ли плакать!

Плакать оттого, что, оказывается, в Беларуси есть люди, которые думают, что возможно привлечь Ермошину к уголовной ответственности. Зачем уважаемый ветеран труда занимается пустым делом? Да у нас ни один суд не примет иск с таким требованием!

Смешно же становится оттого, что, оказывается, есть белорусы, которые верят в то, что смена Ермошиной приведет к тому, что выборы у нас будут проводиться самым честным образом. Если Ермошина уйдет на пенсию, то вместо нее станет такой, как Лозовик, а может быть, даже еще более покладистый к власти.

А если серьезно, то я диву даюсь, о чем иногда пишут в "Народную Волю" ее читатели. Военный пенсионер объясняет, как выбрать лучшего кандидата в президенты, ветеран труда и спорта призывает министров проявить совесть (если, конечно, у них она есть!), адвокат объясняет, как провести какой-то референдум (на мой взгляд, еще одна бредовая в наших условиях идея), кто-то предлагает найти лидера оппозиции и т.д. и т.п.

Уважаемые белорусы! Ради Бога, успокойтесь, не ломайте копий. Неужели вам не понятно, что, пока у руля А.Г.Лукашенко, никаких настоящих референдумов не будет, никаких *честных* выборов не будет и меняться председатели ЦИК по инициативе ветеранов труда тоже не будут!

В.А.РУСЕЦКИЙ.

Минск.

P.S. Уважаемая редакция!

Конечно, я не могу "тягаться" с темами, которые так регулярно умудряются поднимать в вашей газете то пенсионерка, а то зоозащитница Р.Рубинчик, то ветеран спорта и труда Ю.Ясинский. Тем не менее надеюсь, что вы изыщите возможность ознакомить читателей моей любимой газеты и с моим мнением.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Спачыла светлая душа

Алу Ходан ведалі многія, што засведчыла і сумная развітальная часіна: у рытуальнай зале бальніцы, дзе стаяла труна з нябожчыцай, было людна, шмат хто з яе сябрыны прамаўляў прачулыя словы, жанчыны выціралі слёзы, з вуснаў прысутных прагучаў "Магутны Божа".

А на сайтах charter 97, svaboda ды іншых прайшла аднабокая інфармацыя, што Ала Ходан для сябраў клуба "Беларуская хатка" ладзіла вандроўкі па літаратурных і гістарычных мясцінах нашай краіны. Хоць гэта і праўда, ды не ўся.

Самае галоўнае тое, што, як сцвярджае народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, Ала Міхайлаўна спрыяла беларускай нацыянальнай ідэі. Яна і сама з'яўлялася яе дзейснай носьбіткай. Цудоўны арганізатарскі талент дазваляў ёй праводзіць у сталіцы цікавыя вечарыны, удзельнікамі якіх не раз былі акадэмік Радзім Гарэцкі, доктар філалагічных навук, прафесар Адам Мальдзіс, слынныя паэты Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Эдуард Акулін, бібліяфіл Міхась Казлоўскі, іншыя знакамітасці. А.Мальдзіс нездарма так ласкава і трапна назваў Алу Ходан "пчолкай". Эканаміст па адукацыі, яна ўсёй сваёй светлаю душою імкнулася да роднай культуры. Шмат чытала, нястомна распаўсюджвала беларускія кнігі і часопісы. З асабістага архіва даравала музеям і бібліятэкам падпісныя выданні, асобныя кнігі, зборнікі, нумары незалежнага часопіса "Дзеяслоў", падшыўкі дэмакратычных газет. Яна валодала шчодрым талентам любові да людзей. Паэты ёй прысвячалі вершы. У свой час у кнізе "Не завіце радзіму малой" (2009) я змясціў трыялет, прысвечаны Але Міхайлаўне Ходан:

Служэнне кнізе беларускай
Здзіўляе вытрымкай сваёй,
Любоўю моцнае святой
Служэнне кнізе беларускай.
Калі прастой, калі застой,
А шлях сышоў да сцежак вузкіх,
Служэнне кнізе беларускай
Здзіўляе вытрымкай сваёй.

Здзіўляла — гэта значыць уражвала — тое, як усюды паспявала гэтая зусім не моцнага здароўя жанчына (калісьці была збіта і пакалечана машынай).

Гарачае сэрца, няўрымслівая душа, чыстае сумленне — гэтыя рысы Алы Ходан застануцца ў памяці яе суайчыннікаў.

Васіль ЖУКОВІЧ.

ПЫТАННЕ—АДКАЗ

Чуў, што будуецца Полацкая ГЭС. Што яна будзе сабой уяўляць? Якая магутнасць? Калі пачне дзейнічаць?

Ніна КАРАЛЬКОВА.
Мінск.

...І з'явіцца на Заходняй Дзвіне ГЭС

Так, Полацкая гідраэлектрастанцыя ўзводзіцца ў адпаведнасці з планам. Яе праектная магутнасць — 21,75 мегавата.Станцыя будуецца ў 10 кіламетрах ад Полацка ўверх па цячэнні ракі, недалёка ад вёскі Лучна. Штогод яна будзе выпрацоўваць 110 мільёнаў кВт*г электраэнергіі. Фактычна гэтага хопіць для патрэб усіх бытавых аб'ектаў Полацка. Паколькі ўжо будучай вясной пачнецца ўзвядзенне плаціны, то можна прагназаваць, што праз непрацяглы час Полацкая ГЭС будзе задзейнічана на поўную магутнасць.

ПА ВАШАЙ ПРОСЬБЕ

Маленне за Беларусь

Шаноўная рэдакцыя!

У №97 газеты за 10 снежня з цікавасцю прачытаў тэкст песні "Ave Maria" Ігара Лучанка, на стварэнне якой кампазітара ў свой час натхніў верш Зянона Пазьняка.

А ў мяне такая просьба да рэдакцыі: ці няма ў вас магчымасці адшукаць і надрукаваць сам верш Зянона?

Вера ЯРМОЛЬЧЫК.

Гродна.

Ад рэдакцыі

Шаноўная спадарыня Вера! У гэтыя светлыя калядныя і перадгнавагоднія дні з задавальненнем выконваем вашу просьбу. Верш З.Пазьняка "Гучаньне анёльскага голасу" перадрукоўваем з кнігі "Сапраўднае аблічча", якая выйшла ў Мінску ў 1992 годзе.

Віншуем Вас са святамі, зычым усяго самага добрага, прыгожага, жаданага! І, канечне ж, нашы самыя шчырыя і сардэчныя віншаванні аўтару гэтага цудоўнага верша, адданаму сыну Беларусі Зянону Станіслававічу Пазьняку. Хай далятае да яго і саграваеу, дае новыя сілы дыханне любай Бацькаўшчыны.



Гучаньне анёльскага голасу

У цішы над Зямлёй
У эфіры начным
Голас жаночы гучыць:
— Авэ, Марыя, грацыя плена... —
Чысты, як срэбны струмень
на радзіме,
Як сонечны бляск
у крынічнай вадзе. —
Авэ, Марыя, грацыя плена...
Беражы, сьцеражы нас
у чорнай бядзе.
Да прыёмніка вухам прынік
Я далёка ў лясной старане,
Там, дзе сосны шумяць
пад дажджом,
Там, дзе хмары бягуць
над вадой.
Авэ, Марыя, грацыя плена...
Гучыць над начною Зямлёй.

1987 г.

КОРОТКО

Новогоднее послание Сноудена

Бывший контрактник Агентства национальной безопасности США Эдвард Сноуден, предавший огласке детали программы электронного слежения со стороны американских властей, обнародовал свое "альтернативное" рождественское обращение к международному сообществу, призывая прекратить массовую слежку за гражданами.

Видеообращение Сноудена транслировалось по 4-му каналу британского телевидения как бы в пику традиционному рождественскому обращению королевы Елизаветы II.

Эдвард Сноуден заострил свое внимание на праве на частную жизнь, сказав, что "родившийся сегодня ребенок вырастет, не зная, что такое приватность". "Дискуссии, ведущиеся сейчас, определят, насколько мы сможем доверять окружающим нас технологиям и правительству, которое регулирует их использование". "Все вместе мы можем найти лучший баланс, прекратить массовую слежку и напомнить правительству, что если оно и в самом деле хочет узнать, что мы думаем, то задать вопрос легче, чем шпионить".

Уходящий год принес серьезные перемены финансовому миру

Европа продолжает бороться с кризисом, но свет в конце туннеля все же появился: еврозоне удалось наконец выйти из состояния рецессии. А к концу года Евросоюз сделал большой шаг на пути создания банковского союза. Американские политики также сумели достичь компромисса по бюджету страны, а это означает, что "выключение" правительства и заморозка в крупнейшей экономике мира не повторится.

Бизнес в 2013 году пытался найти способ не только выжить, но и преуспеть. Одним так и не удалось сделать это в одиночку, другие приятно удивили. Но так или иначе, всем приходится быть креативными. А что может быть креативнее, чем инновационные технологии?

По случаю юбилея Мао Цзэдуна

В 120-ю годовщину со дня рождения основателя КНР Мао Цзэдуна по всему Китаю проходят торжественные мероприятия. Агентство Синьхуа сообщает, что высшие руководители Китая, в том числе председатель КНР Си Цзиньпин, посетили мавзолей Мао в Пекине, чтобы отдать дань уважения.

В официальной газете компартии China Daily вышла статья, в которой говорится, что лучший способ отдать дань памяти Мао — это продолжить экономические реформы, хотя они и начались уже после его смерти.

Жертвы стихий

40 человек погибли в Бразилии в результате наводнений, вызванных сильнейшими проливными дождями, которые обрушились на юго-восток страны. По оценкам властей, из-за стихии около 50 тысяч бразильцев остались без крова.

Число жертв обильных снегопадов, ледяных дождей и торнадо, которые обрушились на США и Канаду, составило, по последним данным, 27 человек, сообщает агентство Ассошиэйтед Пресс. Полмиллиона граждан отпраздновали Рождество при свечах из-за шторма.

Самый честный таксист

300 тысяч долларов, забытые во время поездки в Лас Вегас одним из клиентов, таксист Жерардо Гамбоа присваивать не стал. Он немедленно позвонил диспетчеру своего парка и сообщил о находке, а сидящего в это время в машине пассажира призвал в свидетели. А на вопрос, не промелькнула ли у него мысль о том, чтобы оставить деньги себе, ответил: "Нет-нет-нет, что вы! Ни секунды не раздумывал, сразу же и отдал".

Компания Yellow Checker Star, в которой работает Гамбоа, выдала ему за честность премию в тысячу долларов, присудила звание "Водитель года" и оплатила обед на двоих в ресторане класса люкс.

А пассажир, получивший свои деньги обратно, пообещал ему вознаграждение лично от себя.

СТОП-КАДР!



Прэзідэнт ЗША Барак Абама, яго жонка і дачка сустрэліся з памочнікамі Санта Клауса. Іх ролю выконвалі былыя пацыенты Дзіцячага медыцынскага цэнтра ў Вашынгтоне.

Прощай, год стихийных бедствий!

В 2013 году мир столкнулся с 39 погодными катастрофами, ущерб от каждой из которых оценивается минимум в миллиард долларов. Вот некоторые из них.

Австралия: самое жаркое лето

Никогда еще на континенте не было такого лета. Январь 2013 года в Австралии был самым жарким месяцем за все время наблюдений. 18 января Сидней поставил новый температурный рекорд — +45,8 градуса по Цельсию.

Лесной пожар в Калифорнии, США

+ **фото 92**

Пожар в парке Йосемити начался в конце августа и в конечном итоге охватил более тысячи квадратных километров. Это третий крупнейший пожар в истории штата, он охватил территорию больше, чем все остальные пожары в Калифорнии за этот год вместе взятые. Окончательно потушить его удалось лишь 26 октября — спустя более чем два месяца после начала.



Бразилия: сильнейшая засуха за 50 лет

С января по май на северо-востоке Бразилии стояла разрушительная засуха. Она была самой сильной за последние 50 лет. Ущерб — порядка 8 миллиардов долларов. По мнению некоторых экспертов, сухость повлияла на североатлантический сезон циклонов, которые были в этом году значительно мягче, чем ожидалось.

Наводнение в Колорадо

Метеоролог Мартин Хорлинг говорит, что из-за наводнения "2013 год стал самым влажным месяцем в истории". Дожди, выпавшие в сентябре в Колорадо, были такими сильными, что в некоторых районах это было самым сильным бедствием за последнюю тысячу лет. Общий ущерб оценивается в 2 миллиарда долларов. Виновато ли глобальное потепление? Да, оно вносит свой небольшой вклад в увеличение числа осадков.



Тайфун Хайян на Филиппинах

Тайфун Хайян на северо-западе Тихого океана достиг пятой категории силы, по скорости ветра (195 миль в час) он, вероятно, самый сильный ураган за всю историю наблюдений. Погибли более 6000 человек, более тысячи человек по-прежнему считаются пропавшими без вести.

Смертельные муссоны на севере Индии

Самое губительное официально зарегистрированное в 2013 году погодное явление случилось на севере Индии и в Непале: в результате наводнения погибли порядка 6500 человек. Бедствие было вызвано выпадением сильных муссонных дождей над индийским штатом Уттаракханд. В столице штата за 24 часа выпало более 14 дюймов осадков, это рекордная цифра. Муссонные наводнения зачастую смертоносны, а это стало самым губительным из всех.

Центральная Европа: историческое наводнение

В конце мая — начале июня многие центральноевропейские страны, включая Германию, Швейцарию, Австрию и Чешскую Республику, пострадали от рекордного наводнения, когда Дунай, Влтава и Рейн вышли из берегов. Общий ущерб оценивается в 22 миллиарда долларов — наводнение стало пятым в списке самых дорогих стихийных бедствий, произошедших за пределами США, за всю историю наблюдений. Это было самое сильное наводнение в Европе со времен средневековья, считает метеоролог Джефф Мастерс.



ЯПОНИЯ

Ажиотаж фукубукуро

В японских магазинах развернулась подготовка к одной из самых важных стратегических операций в розничной торговле — продаже мешков счастья. Мешки начинают продавать во всех магазинах по всей Японии утром 1 января, и в самые известные торговые точки бойкие покупатели занимают очередь еще 31 декабря.

В первые дни Нового года все прилавки будут заполнены этими тщательно запечатанными пакетами из плотной яркой бумаги. Так в чем же их суть? А суть в том, что вы на деле покупаете кота в мешке, пусть ему и имя фукубукуро (в переводе "счастливая сумка").

Продавец ни за что не расскажет, что находится в мешке, может только раскрыть категорию товара, например — косметика, постельное белье, инструменты для любителей мастерить. Но одно правило выполняется неукоснительно — реальная цена положенных в мешок счастья товаров будет намного выше той, которую заплатит покупатель, отмечает ИТАР-ТАСС.

Так, в универмаге "Мицукоси" города Нагоя заметно увеличено число особо дорогостоящих мешков, то есть свыше 100 тысяч иен (более тысячи долларов). В одном из них будет спрятан, например, набор из кольца и ожерелья с бриллиантами за 20,1 миллиона иен (примерно 200 тысяч долларов).

В других универмагах Японии заготовлены мешки счастья с дорогостоящими часами, путевками шикарных морских круизов, наборами изысканных кимоно ценой в многие десятки тысяч долларов. Коммерсанты рассчитывают на то, что благодаря наметившемуся в стране росту экономики и росту курса акций сейчас заметно расширился круг людей, готовых потратить лишние деньги на кота в мешке.

Стратегической же эту операцию можно назвать по той простой причине, что в первый же день продаж многие известные универмаги делают самую внушительную выручку за весь год. Впрочем, для большинства простых японцев обычный мешок счастья — это часть новогоднего настроения, связанного с веселым ожиданием чего-то хорошего и неожиданного.

ПОД ГРИФОМ «СЕКРЕТНО»

Тайная дипломатия Геншера

Во внезапном помиловании Михаила Ходорковского много загадок, и одна из них — роль в этом деле экс-главы МИД ФРГ Ганса-Дитриха Геншера.

Хотя выражение "тайная дипломатия" обычно употребляется в отрицательном смысле, последние события снова подтвердили, что серьезные дела по большей части именно так и делаются. *"Правительство Германии ценит усилия бывшего федерального министра Геншера, который провел огромную закулисную работу",* — заявил пресс-секретарь канцлера Ангелы Меркель. Известно, что Геншер заказал частный самолет, доставивший Ходорковского в Берлин, и встретил его в аэропорту Шёнефельд.

Частично приоткрыл завесу тайны сопровождавший Геншера и выступавший в роли переводчика немецкий эксперт по России Александр Рар. *"Он (Геншер) добился успеха, и это триумф германской тайной дипломатии. Из происшедшего видно, что Германия до сих пор располагает в России каналами и возможностями, которых нет ни у англичан, ни у американцев. Геншер показал себя фантастическим игроком, что делает ему честь",* — заявил он в интервью журналу Spiegel.

Немецкая пресса пишет, что именно Геншер убедил Путина не настаивать на признании Ходорковским вины. На вопрос российского сайта "Правда.ру", так ли это, Рар ответил утвердительно. Политолог подчеркнул, что тайная дипломатия, во-первых, не терпит публичности, во-вторых, подразумевает прагматизм и готовность к компромиссу.

Хотя Геншер, по его словам, принял на себя посредническую миссию в деле освобождения Ходорковского примерно два с половиной года назад и за это время дважды встречался с Путиным, о его роли до последнего времени никто не знал. *"Не секрет, что почти все западные политики просили Путина совершить этот гуманный акт. Но Германия здесь действовала, возможно, более дипломатично. Никогда господин Геншер не говорил и не хотел говорить о вине или невиновности Ходорковского. Просто просил Путина сделать гуманный шаг. Всем известно, что с помощью нажимов и криков с российской властью договориться невозможно",* — заметил Рар российским журналистам.

В мире вряд ли найдется другой человек, подходящий для столь деликатной миссии так, как 86-летний Геншер. Среди ветеранов дипломатии по известности и авторитету его можно сравнить только с Генри Киссинджером.

Геншер родился и жил в городе Галле, который после войны оказался в советской зоне, а затем стал частью ГДР. В Западную Германию он перебрался в 1952 году (тогда граница между Восточным и Западным Берлином еще была открыта), получил юридическое образование и занялся политикой. Целые поколения немцев помнят знаменитый желтый пуловер Геншера (желтый и голубой цвета являются символами либеральной Свободно-демократической партии (СвДП), которую он возглавлял в 1974—1985 годах и в которой состоит и поныне).

Главным делом его жизни стало воссоединение Германии, хотя большая часть лавров досталась, естественно, канцлеру Колю. Как утверждал в интервью Русской службе Би-Би-Си бывший помощник Горбачева по международным делам Анатолий Черняев, Геншер заверял советского лидера, что Бонн не станет спешить с объединением. Одновременно Геншер сумел убедить западных партнеров, прежде всего Лондон и Париж, что единая Германия не станет претендовать на политическую гегемонию в Европе. Он также сыграл видную роль в упорядочивании отношений между Москвой и постсоветскими государствами в момент распада СССР, говорится на сайте Би-Би-Си.

Подготовил к печати Антон КЛЕВЦЕВИЧ.



Khodorkovsky's Facebook page (Courtesy Photo)

ИХ НРАВЫ

Сильвио Берлускони остался без елки на Рождество, а его подруга — без мотоцикла

Бывший премьер-министр Италии Сильвио Берлускони в 2013 году отменил традиционное празднование Рождества на принадлежащей ему вилле Бельведере недалеко от Милана, где раньше к празднику устанавливали гигантскую ель. Как пишет газета Corriere della Sera, соответствующее решение принято из соображений экономии, которой теперь вынужден придерживаться политик.



Более того, вся прислуга на вилле, где Берлускони жил со своей бывшей женой, уже получила письма об увольнении.

Corriere della Sera сообщает также, что без подарка на Рождество останется нынешняя возлюбленная 77-летнего экс-премьера — 29-летняя Франческа Паскале. Политик отказался купить ей мотоцикл Harley Davidson, о котором Паскале давно мечтала. Это решение, впрочем, Берлускони объяснил заботой о безопасности подруги.

ДОБРЫ ПРЫКЛАД

Тысячы людзей спявалі калядкі дзяўчынцы

Жыхары амерыканскага штата Пенсільванія зладзілі свята для 8-гадовай дзяўчынкі Дылэні Браўн, якая пакутуе на анкалагічнае захворванне.

Нядаўна яна прызналася, што вельмі хоча пачуць калядныя спевы, але стан здароўя не дазваляе ёй пайсці ў святыню. Тады жыхары штата сабраліся каля яе дома і праспявалі для яе.

Ад 5 да 10 тысяч чалавек прыйшлі да дома сям'і Браўн, каб праспяваць калядкі, пры тым што насельніцтва гарадка Уэст-Рыдзінг складае крыху больш за 4 тысячы. З-за іх на вуліцы каля дома Дылэні прыйшлося перакрываць рух.

Дзяўчынка падзякавала за калядкі на старонцы ў Facebook. "Цяпер я вас чую! Люблю вас усіх!" — напісала яна.

Соединенные Штаты Аравии

Эр-Рияд предложил соседним странам объединиться

Саудовская Аравия активизировала усилия по объединению арабских монархий Персидского залива в некий союз, призванный противостоять растущему влиянию Ирана.

Идея трансформировать Совет сотрудничества стран Персидского залива в нечто большее родилась в Эр-Рияде еще в прошлом десятилетии. Саудовская Аравия была не на шутку обеспокоена растущей экономической и военной мощью своего главного соперника в регионе — Ирана. Нервозности королю Абдулле добавляло и то обстоятельство, что у руля в Тегеране тогда находился Махмуд Ахмадинежад, сделавший ставку на форсированное развитие ядерных технологий и поддержку единоверцев-шиитов, живущих в арабских странах.

По мнению короля и его приближенных, сдержать рост иранского (и, соответственно, шиитского) влияния можно было бы, объединив силы арабских суннитских монархий. Отсюда и родилась идея сформировать союз, в который помимо Саудовской Аравии вошли бы Бахрейн, Кувейт, Катар, ОАЭ и Оман. Однако отношение приглашенных стран к инициативе Эр-Рияда по ряду причин оказалось весьма неоднозначным.

"Мы хоть сегодня готовы подписать декларацию о союзе, чтобы подтвердить нашу железную волю и твердую решимость", — заявил 16 декабря король крошечного Бахрейна Хамад ибн Иса аль-Халифа. Причина такой позиции его величества ни для кого большим секретом не является. Дело в том, без Саудовской Аравии король Бахрейна может и вовсе лишиться власти. Остальные султаны и эмиры раздумывают, насколько им всем вместе по пути.

Какой цвет кожи у Санта Клауса?

Учитель из штата Нью-Мексико, заявивший чернокожему студенту, что Санта Клаус — белый, отправлен в оплачиваемый административный отпуск. Представитель школьного округа Рио-Ранчо подтвердила, что учитель отстранен от преподавательской работы на период расследования.

Инцидент произошел в одной из школ округа, где ученикам сообщили, что они могут прийти на занятия в костюмах Санты.

По словам Майкла Руджира, его чернокожий сын-девятиклассник Кристофер так и поступил. Однако, когда он появился в классе с бородой и в колпаке Санты, учитель, имя которого не разглашается, спросил его: "Разве ты не знаешь, что Санта Клаус — белый? Зачем ты это наделал?" По словам Майкла Руджира, он был возмущен заявлением педагога.

Представитель школьного округа Рио-Ранчо сообщила Associated Press, что учитель признал, что совершил "глупую ошибку", и принес извинения семье Руджир.

Накануне Рождества тема расовой принадлежности Санта Клауса стала предметом национальных споров в США. Обозреватель газеты Washington Post Кэтлин Паркер в своей статье написала: "На первый взгляд Санта, один из самых невинных символов, является просто легкой целью для ревизионистов. Но если посмотреть глубже, внесение разнообразия в образ Санты в стране, избравшей чернокожего президента, кажется вполне уместным".

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

Рыгор СІТНІЦА:

«Крыўды ні на кога не трымаю»

На мінулым тыдні Беларускі саюз мастакоў абраў новага кіраўніка — арганізацыю цяпер узначальвае мастак і паэт Рыгор Сітніца.



«Не веру!»

Трэба заўважыць, што ў Рыгора Сямёнавіча была самая яркая перадвыбарная прамова, у якой было шмат цікавых момантаў...

"Калі нехта думае, што мне вельмі хочацца быць старшынёй Саюза мастакоў, магу пабажыцца: не хочацца! — сказаў Сітніца з трыбуны. — *І пасля сходаў некаторых секцый, якія папярэднічалі з'езду, мне ўвогуле хацелася выйсці з гэтага Саюза...*

Усім сваім нядобразычліўцам хачу сказаць: вы мне не ворагі, і я вам таксама не вораг. Крыўды ні на кога не трымаю, тым больш Каляды зараз — трэба дараваць.

Мая самая галоўная задача — захаваць арганізацыю. Лічу, што ўсялякія даносы страшэнна разбураюць імідж нашага Саюза. Адна з самых галоўных задач, на мой погляд, паляпшэне іміджу арганізацыі".

Рыгор Сітніца распавёў калегам, што апошнім часам правёў нямала сустрэч з чыноўнікамі і нават меў працяглую размову з першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта.

"*Дамовіліся ў бліжэйшы час аднавіць кансультацыі па майстэрнях*, — распавёў ён. — *Ці можа працоўнае месца каштаваць чатыры мільёны, калі пенсія — два? Мне была абяцана калі не асабістая сустрэча з прэзідэнтам, дык хаця б гарантыя, што яму на стол пакладуць ліст ад Саюза мастакоў, бо звычайна далей канцылярыі нашы лісты не трапляюць..."*

Паабяцаў Сітніца і побач з цяперашнім Палацам мастацтва пабудаваць сучасны арт-цэнтр.

"Ёсць магутная інвестыцыйная прапанова, інвестар чакае завяршэння з'езда, гэта самы буйны інвестар у краіне", — заінтрыгаваў ён.

Нягледзячы на прыгожыя словы і добрыя намеры, не ўсе віталі прамову Сітніцы. Так, вядомы беларускі скульптар **Аляксандр Батвінёнак** адразу заўважыў: *"Сказана прыгожа. Настолькі прыгожа, што я аж млею. Але калі я прыходжу ў Саюз мастакоў і бачу разбітую работу Бембеля, якая валяецца пад лесвіцай, то не веру ніводнаму слову! Гэта, між іншым, таксама імідж нашай арганізацыі..."*

Кланаў у Саюзе мастакоў не існуе?

На наступны дзень пасля з'езда, калі крыху суцішыліся эмоцыі і жарсці, "Народная Воля" задала Рыгору Сітніцу некалькі пытанняў.

— Рыгор Сямёнавіч, скажыце шчыра, якія засталіся ўражанні ад з'езда?

— Вельмі складаныя, але ў рэшце рэшт станоўчыя. Рады, што калегам хапіла розуму сцішыць анархію і другая палова з'езда прайшла ў спакойным русле. Вялікіх сутыкненняў не было.

У сваёй праграмнай прамове я падкрэсліў, што трэба мацаваць нашу культуру, трэба павышаць духоўнасць і не забывацца, што мы — прадстаўнікі культурнай эліты нашай нацыі. І сорамна скочвацца ў нейкі базар...

— Ведаю, што вашу прамову адзначылі нават тыя, хто не аддаў за вас свой голас.

— Так, да мяне некаторыя падыходзілі падчас з'езда. Напрыклад, той жа Андрэй Смаляк, які, думаю, не галасаваў за мяне, сказаў, што прамова была моцнай. Між іншым, нават не важна, хто за каго галасаваў. Мяне абралі старшынёй усяго саюза, і для мяне няма сваіх і чужых мастакоў. У мяне адзіны прыярытэт: падтрымліваць тых, хто актыўна займаецца творчасцю. І я буду гэта рабіць, не зважаючы на тое, падабаецца мне мастак альбо не.

— Самым моцным вашым канкурэнтам быў Уладзімір Слабодчыкаў. Яго характарызавалі як *"талерантную фігуру, якая не дапусціць кланавасці ў Саюзе мастакоў".* І даволі шмат людзей былі не за вас, а за яго…

— Я разумею, чаму так адбылося. Слабодчыкаў — дастаткова аўтарытэтная асоба. І ён цалкам заслужана атрымаў гэтыя галасы.

— Не збіраецеся прапанаваць яму пасаду ў Саюзе мастакоў? Напрыклад, зрабіць адным з намеснікаў…

— Не збіраюся. Але не таму, што не люблю Слабодчыкава, а таму, што ўжо вызначыўся са сваім першым намеснікам. Алесь Дранец, якога я запрасіў на пасаду першага намесніка, — чалавек адданы і прынцыповы. Нядаўна яшчэ лічылася, што ён чалавек не з майго лагера. Хаця, падкрэсліваю, ніякіх лагераў у Саюзе быць не павінна, і для мяне іх не існуе. Проста лічылася, што Алесь Дранец быў у апазіцыі да папярэдняга кіраўніцтва Саюза. Мы змалку адзін аднаго ведаем, я паважаю яго як мастака і як асобу, ён адпавядае пасадзе па ўсіх сваіх дзелавых якасцях. На мой погляд, гэта відавочна прымірэнчы крок, і я гэта падкрэсліў у сваім выступленні.

— Так, вы заўважылі, што гэтым прызначэннем скасуеце *"размовы аб кампанейшчыне",* якая нібыта існуе ў Саюзе.

— Прынамсі, я пастараюся гэта зрабіць, але разумею, што дарэшты іх не скасуеш.

— У сваім выступленні вы паабяцалі панізіць плату за майстэрні, але гэтым абяцаннем ужо багата гадоў…

— Я не абяцаў, а сказаў, што ёсць дамоўленасць на ўзроўні высокіх урадавых кабінетаў працягнуць гэтую гаворку. І мы будзем спрабаваць вырашыць гэтае пытанне.

— Вы самі верыце, што гэта магчыма?

— Веру, іначай не вёў бы пра гэта гаворку! І дзе толькі можна, буду ўздымаць гэтае пытанне, пакуль яно не вырашыцца. Было б значна лягчэй, калі б палёгку зрабілі хаця б для старых людзей, для пенсіянераў, для народных і заслужаных мастакоў. Карацей, гэта вельмі актуальная праблема, і яна будзе стаяць на парадку дня.

— Вы вялі гаворку пра будаўніцтва новага арт-цэнтра. Я толькі не зразумела, Палац мастацтва будзе зруйнаваны альбо не?

— Ёсць інвестыцыйныя прапановы...

— А што за інвестар?

— Пакуль не магу назваць, бо інвестар не хоча агалоскі. Але ёсць цікавая прапанова збудаваць у двары нашага палаца яшчэ адзін палац. Калі гэтая прапанова ажыццявіцца, ніякага руйнавання старога палаца не будзе, магчыма, толькі адбудова і пашырэнне нашых плошчаў і стварэнне новых.

— Вам сапраўды абяцалі сустрэчу з кіраўніком дзяржавы?

— Было дамоўлена аб аднаўленні размовы пра праблемы мастакоў на самым высокім узроўні. Гэта ўсё, што пакуль магу сказаць.

— Як думаеце, Мінюст прызнае з'езд Саюза мастакоў легітымным?

— Не бачу падстаў яго не прызнаваць. Усё было зроблена законна, мы вельмі стараліся, каб нічога не было парушана, працавалі па сцэнарыі, які паказалі ў Мінюсце. Між іншым, па такім жа сцэнарыі праводзіць свае з'езды Федэрацыя прафсаюзаў, мы стараліся максімальна адпавядаць. Таму не ведаю, якія патрэбны падставы, каб не прызналі з'езд...

— Тады шчыра жадаю поспехаў на новай пасадзе!

— Дзякуй! Я ведаю, у якую справу ўвязаўся, і буду старацца. Галоўнае, каб Бог даў сілы на ўсё гэта. А што тычыцца нядобразычліўцаў... Мяне вельмі цяжка нечым дастаць. Я па сваёй прыродзе чалавек не ваяўнічы і не канфліктны, такі міралюбца — стараюся ўсіх мірыць. Думаю, будзе мір у нашым Саюзе!

Што засталося за кадрам

На пасаду старшыні Саюза мастакоў акрамя Сітніцы балатаваліся яшчэ трое: **Генадзь Буралкін, Алесь Суша** і **Уладзімір Слабодчыкаў**. Самым моцным канкурэнтам Сітніцы стаў менавіта вядомы скульптар Слабодчыкаў. Пры галасаванні за яго аддалі 101 голас, за Сітніцу — 132. Нязначную колькасць галасоў адцягнулі дзве іншыя кандыдатуры — за іх агулам прагаласавалі 16 чалавек.

З'езд пачаўся ў 10 гадзін ранку, старшыню Саюза пачалі абіраць толькі пасля абеду, а вынікі галасавання сталі вядомыя аж бліжэй да дзясятай гадзіны вечара!

Далёка не ўсе сябры Саюза засталіся задаволеныя вынікамі выбараў. Так што Рыгору Сітніцу прыйдзецца яшчэ заваёўваць павагу і прыхільнасць некаторай часткі сябраў Саюза мастакоў.

Дарэчы, адным з самых спрэчных пытанняў з'езда стала колькасць дэлегатаў. Далёка не ўсе пагадзіліся з квотай "адзін дэлегат ад чатырох сябраў", якую зацвердзіла Рада Саюза. На наступным з'ездзе спрэчак з гэтай нагоды быць не павінна: мастакі прагаласавалі за тое, каб на з'ездах прысутнічала роўна палова сябраў арганізацыі.

У ТЭМУ

Экспрэс-выстава для сваіх



Андрэй Смаляк таксама не разумее, чаму юбілейная выстава была толькі для "сваіх".

За некалькі дзён да пачатку юбілейнага з'езда Саюза мастакоў у Палацы мастацтва павінна была ўрачыста адкрыцца выстава, карціны на якую прывезлі мастакі з усёй краіны. Але, паколькі перад з'ездам мастакі перасварыліся, урачыстае адкрыццё адмянілі. На творы мастакоў можна было паглядзець падчас з'езда, але для шырокай публікі выстава была недаступная. Дый рэкламы ніякай не было.

А цяпер вернісаж ужо не працуе — мастакі разбіраюць творы.

"*Выстава працавала толькі да 25 снежня*, — сказалі "Народнай Волі" ў Палацы мастацтва. — *Урачыстага адкрыцця не было. Чаму так хутка скончылася? Так вырашыў Саюз мастакоў, там і запытайцеся..."*

Некаторыя творцы кажуць, што карціны знялі, бо залу здалі ў арэнду: перад Новым годам ёсць магчымасць зарабіць лішнюю капейчыну.

"Народная Воля" задала пытанне пра экспрэс-выставу намесніку старшыні Саюза мастакоў па выставачнай дзейнасці **Леаніду Хобатаву.**

— *Мы так вырашылі, мы недзяржаўная арганізацыя, нам ніхто загады зверху не аддае, мы самі вызначаем, колькі будзе ісці тая ці іншая выстава,* — адказаў Леанід Васільевіч. — *Гэта была выстава не для шырокай публікі, а ў фармаце "для сваіх". Яна была прымеркавана да з'езда. Мы павінны былі паглядзець на тое, на што мы здольныя...*

Што тычыцца таго, што гэтае памяшканне цяпер здаецца ў арэнду, дык гэта не чуткі. Мы пад камерцыйныя выставы аддаём нямала часу. Нам трэба зарабляць грошы — у гэтым няма ніякай тайны. Мы павінны выжываць, прыводзіць у парадак той жа Палац мастацтва, а для гэтага патрэбны грошы... Але пры гэтым у нас дастаткова і творчых выстаў, практычна ўсе задаволены, і тыя, хто хоча выставіцца, — выстаўляюцца...

Марына КОКТЫШ.

ПЕРСОНА

Дарья Домрачева снялась в пикантной фотосессии

Известная биатлонистка увлеклась самолетами.



Принято считать, что компьютерные игры и здоровый образ жизни несовместимы. Так, от долгого сидения за компьютером портятся глаза и нарушается осанка. Белорусская компания-разработчик Wargaming решила доказать обратное, устроив тематическую фотосессию, посвященную многопользовательской игре "World of Warplanes", с одной из главных претендентов на победу на Олимпиаде в Сочи, двухкратной чемпионкой мира по биатлону **Дарьей ДОМРАЧЕВОЙ**.

Девушка примерила на себя несколько образов, в числе которых был, например, пилот самолета в кожаной куртке и очках-авиаторах, а также более "домашний" образ — на одной из фотографий Даша, одетая в теплый свитер и уютные штаны, увлеченно мастерит самолет. Кстати, самолетная тематика не в новинку для белорусской чемпионки. Ее брат в детстве всерьез увлекался коллекционированием самолетных моделей и приобщил к своей страсти и Дашу.

— *Первое, что я видела по утрам, — маленькие ИЛ-2 и "Спитфаер"*, — цитирует спортсменку eg.ru. — *Брат привязывал модельки к потолку, и они словно парили в воздухе. К тому же полет на самолете так захватывает дух! Уверена, если бы я не была спортсменкой, то обязательно стала бы летчицей. И когда мне предложили поучаствовать в подобном проекте, то согласилась без разговоров.*

— *Мы не хотим, чтобы наши игроки слишком засиживались за компьютером,* — говорят представители Wargaming. — *Нужно, чтобы они гуляли, вели здоровый образ жизни, занимались активным спортом.*

Кроме того, сейчас мы активно продвигаем такое направление, как киберспорт: в нашей лиге призовой фонд уже более 2,5 миллиона долларов, и в скором времени, мы уверены, по популярности он сравнится с большим спортом.

На приклад винтовки Дарьи Домрачевой во время Олимпиады будет нанесен логотип "World of Warplanes", что, как надеется спортсменка, поможет ей взять золото. Ну а в свободное от тренировок время Даша теперь рассекает небо на виртуальных полях сражения.

Артем КОСТЕНКО.


БЛІЦ

Дзе будзеце святкаваць Новы год?

На 31 снежня ў афішы многіх тэатраў і культурніцкіх устаноў запланаваны мерапрыемствы на розны густ: і канцэрт класічнай музыкі ў філармоніі, і навагодні вактэйль з джаза і мюзікла ў Музычным тэатры, і спектаклі. Адным словам, аж вочы разбягаюцца!

"Народная Воля" запыталася ў некаторых асоб, якія ў іх планы на 31 снежня і дзе яны будуць адзначаць свята.

Аляксандр ВАРЛАМАЎ, мадэльер:



— Новы год — гэта ўсяго толькі змена запісу ў календары і не больш. З прыходам Новага года ў жыцці наогул нічога не мяняецца. І так было заўсёды. А вось змена пары года — гэты сапраўды цудоўна. Калі свята адзначалася 1 сакавіка (да XV стагоддзя) і 1 верасня (да XVII стагоддзя), у ім быў сэнс. А ў тым варыянце, як зараз, свята толькі для тых, хто верыць у Дзеда Мароза. Кожная раніца і кожны вечар, кожныя ноч і дзень — яны непаўторныя. І для мяне кожны дзень — свята.

У гэты Новы год прапаноў ад блізкіх пакуль што няма, але ж яны дарослыя людзі! Мае мары ў ноч на 1 студзеня не спраўдзяцца — гэта ў прынцыпе немагчыма. Але ж парадуюся аліўе шалёнай радасцю — як быццам ніколі яго не спрабаваў!

Павел ХАРЛАНЧУК, артыст Купалаўскага тэатра:



